Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
13 ВЕРАСНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 177 (30057)

ХТО ІДЗЕ Ў НАРОДНАЕ АПАЛЧЭННЕ

МС





ЭЛЕКТРАСОН — ЛЕКІ АД УСЯГО

12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **20 верасня Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян у Мінску.**
- Экалагічная акцыя «Мы клапоцімся» стартуе ў Беларусі 16 верасня.
- **Нацыянальная прэм'ера гістарычнага фільма «На другім беразе» адбудзецца 14 верасня.**
- Мясніковіч прапанаваў стварыць сучасныя і надзейныя сістэмы разлікаў паміж краінамі ЕАЭС і БРІКС.
- **«Белавія» аднавіла паслугі анлайн-рэгістрацыі і выбару месцаў у салоне.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ГІГІН, старшыня РДГА «Веды», генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:**

*«Часта нашы крытыкі за мяжой малююць вобраз Беларусі, дзе ўсё заціснута. У нас база агульная, але меркаванні адносна нейкіх шляхоў развіцця могуць адрозніваць, і гэта добра адлюстравана ў нядаўняй дэкларацыі патрыятычных сіл, дзе заяўлена, што якраз Канстытуцыя, нашы дзяржаўныя сімвалы, павага да дасягненняў суверэннай Беларусі, курс нашага Прэзідэнта — гэта аснова, а далей мы можам абмяркоўваць. Ні ў якім разе нельга заціскаць такія жывыя зносіны, і тое, што людзі гэта разумеюць, радуе. Мы такім чынам фарміруем атмасферу выбарчай кампаніі, якая мае адбыцца».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЧЫМ БОЛЬШ АСАБІСТЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ — ТЫМ МАЦНЕЙШАЯ НАША БЕЛАРУСЬ»

## Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды

**Адпаведны ўказ быў падпісаны 7 верасня. Дзяржаўных узнагарод удастоены 60 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. Ордэны, медалі і ганаровыя званні прысуджаны за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры ратаванні людзей падчас пажару, заслугі ў воінскай службе і ахове дзяржаўнай граніцы, значны асабісты ўклад ва ўдасканаленне падатковай сістэмы, рэалізацыю сацыяльна-эканамічнай палітыкі краіны, развіццё лесагаспадарчай вытворчасці, транспартнай галіны, машынабудавання і сельскай гаспадаркі, выдатныя дасягненні ў сферах адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры і спорту.**

Сімвалічна, што ўрачыстая цырымонія ўзнагароджвання працавітых, адданых сваёй краіне людзей адбылася напярэдадні дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства. Перш чым атрымаць высокія ўзнагароды і званні з рук кіраўніка дзяржавы, удзельнікі ўрачыстасці падчас экскурсіі азнаёміліся з сімвалам беларускай дзяржаўнасці — Палацам Незалежнасці.



Фота БелТА.

### «ВАШ ЖЫЦЦЁВЫ ДОСВЕД — ЯРКІЯ СТАРОНКІ АГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ»

«Вы прыехалі з розных куткоў Беларусі, да свайго поспеху ішлі таксама рознымі дарогамі, але сёння гэтыя дарогі сышліся ў адзіны шлях — наш шлях, — адзначыў, звяртаючыся да прысутных, Прэзідэнт. — Ён адчыніў перад вамі дзверы сімвала нашай незалежнасці — Палаца Незалежнасці — і прывёў да заслужаных узнагарод».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў гэтай падзеі ёсць пэўны сімвалізм. «Працуючы ў самых розных сферах, ставячы перад сабой самыя розныя мэты, мы дасягаем самых высокіх вынікаў, якія ў выніку становяцца агульным поспехам — поспехам усёй нашай краіны, — падкрэсліў беларускі лідар. — І чым больш асабістых дасягненняў — тым мацнейшая наша Беларусь».

СТАР. 2



# Ведаць, каб не трапіць у бяду

### 21 верасня пройдзе пад эгідай Адзінага дня бяспекі




**Па традыцыі ў чацвёрты чацвер верасня супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях сумесна з прадстаўнікамі іншых ведамстваў праінфармуюць аб надзвычайных сітуацыях, правапарушэннях і злачынствах, якія часцей за ўсё фіксуюцца ў грамадстве. Як паводзіць сябе пры пажары, папярэдзіць любую іншую надзвычайную сітуацыю і не стаць ахвярай злачынцаў, раскажуць спецыялісты.**

Мерапрыемствы Адзінага дня бяспекі перш за ўсё накіраваны на фарміраванне ў грамадства культуры бяспекі жыццядзейнасці, навучанне насельніцтва правілам паводзін ва ўмовах розных надзвычайных сітуацый, а таксама адпрацоўку планаў эвакуацыі пры пажары. У гэты дзень супрацоўнікі МНС наведаюць прадпрыемствы, дзе правядуць трэніровачныя заняткі па эвакуацыі людзей з будынкаў падчас пажару.

Ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам унутраных спраў, Міністэрствам аховы здароўя і Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа ў месцах масавага знаходжання людзей ратавальнікі арганізуюць тэматычныя інтэрактыўныя навучальныя пляцоўкі для насельніцтва.

СТАР. 3

Па сутнасці справы

# Восень — работ восем

### На палях краіны працягваецца масавая ўборка ўраджаю

**Падыходзіць да завяршэння жніво. Як адзначаюць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, намалочана збожжа, уключаючы рапс, звыш 7,1 мільёна тон, з іх 6,1 млн тон збожжавых і зернебабовых культур (з кукурузай) і каля мільёна тон рапсу.**

У прэс-службе Мінсельгасхарча адзначылі, што ўборка кукурузы на зерне вядзецца ў чатырох абласцях краіны: Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Гомельскай. Уборка кукурузы ў гэтых рэгіёнах вядзецца досыць актыўна, бо ўжо ўбрана 23,1 тысячы тон, прыч сярэдняй ураджайнасці 72,9 цэнтнера з гектара. Характэрна, што адначасова вядзецца ўборка культуры на сілас. Ужо сабрана зялёнай масы кукурузы каля 6 мільёнаў. Працягваецца ўборка крупяных культур. Грэчкі намалочана 26,2 тысячы тон. Нядрэнныя паказчыкі складваюцца па просе, якога намалочана 13,8 тысячы тон. Гаспадаркі масава капаюць бульбу — сабрана 146,5 тысячы тон. Працягваецца ўборка цукровых буракоў, якіх накапана ўжо 347,3 тысячы тон.

Сезон нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў насельніцтва ў поўным разгары. Пачалася масавая закупка яблыкаў.

Па дзяржаўнай праграме «Аграрны бізнес» штогод у краіне будуць закладваць не менш за 500 гектараў інтэнсіўных садоў. Гэта дасць магчымасць да 2025-га стварыць дадаткова больш за 2 тысячы гектараў. Усё гэта павялічыць долю айчынных яблыкаў на рынку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

***Аб тым, як ідзе ўборачная ў рэгіёнах, — у матэрыялах нашых уласных карэспандэнтаў.***

СТАР. 4–5

ISSN 1990 — 763X
23177>
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!
Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ЧЫМ БОЛЬШ АСАБІСТЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ — ТЫМ МАЦНЕЙШАЯ НАША БЕЛАРУСЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, кожны з узнагароджаных увасабляе найлепшыя нацыянальныя рысы беларусаў. «Гэта працавітасць, якая праяўляецца ў жаданні развіваць свае здольнасці, пастаянна вучыцца і прафесійна расці, — удакладніў ён. — Гэта патрыятызм, які мы бачым у імкненні служыць Айчыне, гатоўнасці ў любы момант устаць на абарону гэтай Айчыны. Вырошчваючы хлеб, навучаючы і выхоўваючы дзяцей, дапамагаючы людзям з цяжкім лёсам, ратуючы жыцці, вы дэманструеце адказнасць, міласэрнасць і чалавекалюбства беларускага народа — галоўныя яго рысы».

Як заўважыў Прэзідэнт, творчасць гэтых людзей адлюстроўвае прыгажосць і гармонію нашай культуры. «Навуковыя дасягненні паказваюць інтэлектуальную моц, а спартыўныя перамогі — сілу духу нашай нацыі, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Ваш жыццёвы досвед — гэта яркія старонкі нашай агульнай гісторыі, гісторыі суверэннай незалежнай Беларусі».

## «ЖЫЦЬ ТРЭБА ТАК, КАБ НІКОЛІ БОЛЬШ НЕ ПАЎТАРАЦЬ ПАМЫЛАК МІНУЛАГА»

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць узнагароджаным, а ў іх асобе — усім беларусам, якія аддаюць часцінку сваёй душы любімай справе, людзям, роднай краіне.

«Дзень уз'яднання Беларусі — усходняй і заходняй яе часцей — 17 верасня 1939 года мінулага стагоддзя стаў сімвалам нашага нацыянальнага адзінства, непадуладнага часу, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Але гэты досвед сведчыць, што не менш важна быць разам у мірны час, працаваць на карысць свайго народа і Айчыны. І жыць трэба так, каб ніколі больш не паўтараць памылак мінулага, каб быць моцнымі перад абліччам новых пагроз і выклікаў часу, каб захаваць нашу мірную, дзіўную, прыгожую Беларусь для дзяцей і ўнукаў. Жыць трэба так, каб увогуле сорамна не было потым: і табе, і тым, хто за намі прыйдзе».

Перад тым як прыступіць да цырымоніі ўзнагароджання, беларускі лідар яшчэ раз выказаў удзячнасць прысутным за ўсё, што яны робяць, і павіншаваў з надыходзячым святам — Днём народнага адзінства і заслужанымі ўзнагародамі.

Напрыканцы Прэзідэнт пажадаў усім узнагароджаным дзейнічаць так, як спартсмен Антон Смольскі, якому кіраўнік дзяржавы прысвоіў званне заслужанага майстра спорту. «Тры дыстанцыі — тры бліскучыя перамогі, — кажучы аб выніках Кубка Садружнасці, адзін з этапаў якога нядаўна завяршыўся ў Сочы, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі ўсе так будзем адносіцца да працы, калі мы будзем займацца сваёй справай, нічога нам не страшна і вайны ў нас ніколі не будзе. Войны разгортваюцца і з'яўляюцца там, дзе людзі перастаюць працаваць. А перастаўшы працаваць, шукаюць сабе дзікую, страшную працу, забіваючы адзін аднаго. Таму жадаю вам, каб мелі сваю працу, бачылі сваю сям'ю і маглі абараніць сваіх дзяцей і ўнукаў. Ну а мы з ваеннымі сваю працу зробім, калі ў мірны час будзеце годна рабіць сваю працу вы».

**Вераніка КАНЮТА.**

## Меркаванні

***Узнагароджаныя падзяліліся з журналістамі сваімі ўражаннямі ад наведвання Палаца Незалежнасці і першымі эмоцыямі пасля ўручэння высокіх узнагарод і званняў.***

### «Спыняцца на дасягнутым не збіраюся»

Як прызнаўся спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па біятлоне Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімніх відах спорту «Раўбічы» Антон Смольскі, аб тым, што стаў заслужаным майстрам спорту, даведаўся ў інтэрнэце. Першым яго павіншаваў дэкан Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, дзе малады чалавек праходзіць навучанне. Апярэдзіць дэкана мог толькі трэнер Антона, аднак ён не спяшаўся паведамляць спартсмену гэтую навіну: наперадзе ў біятланіста была адказная гонка, таму трэнер не хацеў адцягваць яго ад падрыхтоўкі.

«Для кожнага спартсмена важна мець такое званне, як «заслужаны майстар спорту», — лічыць Антон Смольскі. — Гэта паказчык таго, што спартсмен паказаў адзін з найвышэйшых вынікаў у сваёй кар'еры. Вядома, спыняцца на дасягнутым не збіраюся. Працягваю спартыўную кар'еру і буду далей радаваць балельшчыкаў. Мая мара — зноў апынуцца на п'едэстале на Алімпійскіх гульнях».

У Палацы Незалежнасці Антон быў упершыню. Малады чалавек адчуў вялікі гонар, што ён, звычайны хлопец, прысутнічаў у такім важным для нашай краіны будынку.

### «Уся наша дзейнасць — на карысць краіны»

Заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь стаў начальнік ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл — начальнік дзяржаўнай установы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» Ігар Хлебус. На дырыжорскай рабоце афіцэр — з 1993 года. «Першапачаткова хацеў стаць музыкам, потым падумаў, а чаму б не быць ваенным музыкам, — расказвае гісторыю свайго творчага шляху палкоўнік. — Цяпер я больш вызначаю сябе як афіцэр, бо мы таксама, як і ўсе ваеннаслужачыя, выконваем пастаўленыя задачы. Уся наша дзейнасць — на карысць нашай краіны».

Кампазіцыі, якія выконваюць музыкі ў пагонах, заўсёды задаюць урачысты настрой. Іх нельга не заўважыць сярод іншага рэпертуару, немагчыма не даслухаць да канца. «Галоўная задача нашай музыкі — патрыятычнае выхаванне, — адзначае Ігар Хлебус. — Сама форма абавязвае. Калі наша музыка чапляе слухача, калі ў гэты момант ён з гонарам усведамляе, што з'яўляецца беларусам, — значыць, трапілі туды, куды трэба».

Гэты год багаты для творчага калектыву і яго кіраўніка на ўзнагароды. На пачатку года Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь быў адзначаны прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне».

### «Атрымліваю маральнае задавальненне ад таго, як расце ўраджай»

Намесніку дырэктара Гродзенскага абласнога аграпрамысловага саюза Івану Алізаровічу прысвоена званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. У гэтай сферы ён ні многа, ні мала — амаль паўвека. Вопыт, назапашаны ў сельскагаспадарчай галіне, цяпер перадае маладым спецыялістам і кіраўнікам.

Іван Алізаровіч расказвае, што нават за столькі гадоў, колькі ён прысвяціў аграпрамысловаму комплексу, не паспеў стаміцца. «Кожны дзень нешта новае, — сельская гаспадарка не стаіць на месцы, сур'ёзна рухаецца наперад, — адзначае ён. — Навука далёка пайшла наперад, але ўсёй тэхнікай, якая знаходзіцца на сяле, кіруюць людзі. Таму стары савецкі лозунг — кадры вырашаюць усё — актуальны дагэтуль».

Узнагароджаны прызнаецца, што, калі б яму задалі пытанне, ці хацеў бы ён прайсці свой жыццёвы шлях па-іншаму, адказ быў бы адназначны — не, не хацеў бы. «Атрымліваю маральнае задавальненне ад сваёй работы, ад таго, як расце добры ўраджай, — прызнаецца Іван Алізаровіч. — Імкнуся не адставаць ад усіх тэхналогій, навацый, якія ёсць у свеце».

# «У развіццё Канстытуцыі трэба ўсе законы прыняць»

## На што Прэзідэнт арыентуе парламент

**Ад сустрэч урачыстых — да рабочых. Пасля цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанку. Парламент цяперашняга склікання ўжо заканчвае сваю работу. У лютым на адзіным дні галасавання будзе абраны новы састаў.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў Старшыні Палаты прадстаўнікоў яго ўражаннямі ад работы цяперашняга парламента, спытаў, што атрымалася, а што яшчэ трэба зрабіць. «Хаця мы яшчэ не адзін раз вернемся да гэтага пытання, каб сфарміраваць нармальны састаў будучага парламента», — заўважыў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, хоць новы парламент будзе абіраць народ, неабходна падрабязна праінфармаваць людзей аб сітуацыі, аб тым, як працаваў парламент. Прэзідэнт звярнуў увагу, што людзям трэба нагадаць пра функцыі парламента. Па яго словах, яшчэ з савецкіх часоў склалася меркаванне, што дэпутаты павінны і дах рамантаваць, і плот папраўляць. Але сёння парламент невялікі па колькасці. І галоўная работа дэпутатаў парламента — заканатворчасць.

«Ацэньваючы парламент, сказаць, што недзе нейкія былі недахопы, я не магу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Не было прыкметных недахопаў і ляпаў у рабоце цяперашняга складу парламента». Але, па словах кіраўніка дзяржавы, гэта яшчэ не падвядзенне вынікаў работы дэпутатаў гэтага склікання. Таксама Прэзідэнт адзначыў, што павінен пабываць у парламенце пасля выбараў на апошняй сесіі гэтага склікання.

«Задача на дзясятую сесію — трэба ўсе задачы вырашыць, якія стаяць перад нашым парламентам, таму што новаму складу не варта гэта пакідаць. Ды і мы можам гэта вырашыць. У развіццё нашай Канстытуцыі трэба ўсе законы прыняць. Хацелася б пачуць, што ў нас там засталося, быццам бы нядрэнна ідзём у гэтым плане», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што гатовы адрэагаваць на праблемы, просьбы дэпутатаў, калі яны ёсць.

«Увогуле, ядро парламента нядрэннае, дэпутаты не баяцца выходзіць да людзей, у сродках масавай інфармацыі лідараў парламента мы бачым. Але наступны парламент, натуральна, будзе адрозніваццa ад цяперашняга, бо і задачы глабальныя, і сітуацыя няпростая», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што работа дэпутацкага корпуса гэтага склікання будавалася зыходзячы з новых палітычных, эканамічных рэалій. «Праца была вельмі напружаная: за дзявятую сесію мы прынялі 112 законапраектаў, з іх шэсць распрацаваны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў (а ўвогуле гэтае скліканне распрацавала 10 законапраектаў)».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

#### Створана заканадаўчая база для правядзення адзінага дня галасавання і фарміравання УНС

У размове з журналістамі Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што адным з асноўных кірункаў работы парламентарыяў у час папярэдніх сесій было прывядзенне нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. «Неабходна было адкарэкціраваць 88 законаў. Гэтая работа ўжо праведзена па 79 законах. Засталося яшчэ прывесці ў адпаведнасць 9 законаў, 5 з іх сёння знаходзяцца ў Палаце прадстаўнікоў, 4 — паступяць у найбліжэйшы час», — расказаў ён. Па словах спікера Палаты прадстаўнікоў, створана ўся неабходная заканадаўчая база для правядзення ў 2024 годзе адзінага дня галасавання і фарміравання Усебеларускага народнага сходу.

Цяпер дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у сваіх акругах, сустракаюцца з насельніцтвам, тлумачаць сутнасць канстытуцыйных змяненняў і той палітыкі, якая праводзіцца дзяржавай, Прэзідэнтам і накіравана на забеспячэнне міру, стабільнасці і развіцця Беларусі. Таксама, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, у найбліжэйшы час дэпутатам трэба прыняць шэраг законапраектаў, якія ўжо знаходзяцца там на разглядзе. У прыватнасці, законапраекты аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці, страхавой дзейнасці, ліцэнзаванні, дзяржзакупках, прадпрымальніцтве.

«Безумоўна, тым складам парламента, які цяпер дзейнічае, мы пастараемся папрацаваць так, каб новаму складу засталася мінімальная колькасць законапраектаў з такім разлікам, каб яны маглі плаўна ўвайсці ў заканатворчы працэс», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Дзясятая сесія Палаты прадстаўнікоў адкрыецца 19 верасня 2023 года. Асноўная задача — завяршыць работу па прывядзенні законаў у адпаведнасць са зменамі ў Канстытуцыі. Важнае значэнне мае таксама прыняцце на сесіі бюджэтна-падатковага пакета на 2024 год. Формы ўдзелу дэпутатаў у яго падрыхтоўцы адладжаны, і адпаведныя профільныя камісіі пачалі работу.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць зніклых без вестак пасля паводкі ў Лівіі дасягнула 10 тысяч чалавек



Пра гэта заявіў кіраўнік дэлегацыі Міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца Тамер Рамадан, паведаміла агенцтва Reuters. Міністр грамадзянскай авіяцыі і член камітэта па надзвычайных сітуацыях Хічэм Абу Чкіўат заявіў: «Я вярнуўся з Дэрне. Не перабольшваю, калі кажу, што чвэрць горада знікла. Многія будынкі абваліліся». Улады абвясцілі Кірэнаіку зонай бедства з-за катастрафічнай паводкі і лівеняў, выкліканых цыклонам «Даніэль», і запыталі міжнародную дапамогу. Пра гэта паведаміў прэзідэнцкі савет Лівіі, перадае ТАСС. Улады абвясцілі трохдзённую нацыянальную жалобу ў сувязі з гібеллю людзей у выніку стыхійнага бедства.

### МАГАТЭ будзе дзесяцігоддзямі правяраць якасць вады пасля скіду з «Фукусімы-1»



Гэта адзначаецца ў заяве гендырэктара арганізацыі Рафаэля Марыяна Гросі. «Наш маніторынг будзе доўжыцца на працягу ўсяго часу скіду вады, які, як чакаецца, зойме дзесяцігоддзі», — заявіў ён савету кіраўнікоў МАГАТЭ. Як вядома, 24 жніўня японскія спецыялісты прыступілі да скіду ў Ціхі акіян вады, якая выкарыстоўвалася для астуджэння рэактараў аварыйнай АЭС «Фукусіма-1». Згодна з планам, першы перыяд скіду вады працягваўся 17 дзён, спушчана ўагульнай складанасці 7800 тон вычышчанай вады, разведзенай марской вадой. Рашэнне Токіа выклікала незадаволенасць з боку суседніх краін і ў прыватнасці сярод прадстаўнікоў рыбалоўнай індустрыі, якія асцерагаліся, што спажыўцы будуць адмаўляцца ад любых морапрадуктаў, вылаўленых у гэтай зоне.

Добрая навіна

# ПАДАРУНАК ДА ДНЯ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

## Напярэдадні свята ў Магілёве адкрылі другую чаргу трасы-дублёра

**Учора на месцы адкрыцця другой чаргі пуцеправода-дублёра было надзвычай урачыста. Іграў аркестр, маршыравалі прыгожыя дзяўчаты ў строгіх цыліндрах. Да свята далучыліся прадстаўнікі працоўных калектываў, моладзь. Іх віталі прадстаўнікі кіраўніцтва вобласці і горада на чале з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Ігарам СЕРГЕЕНКАМ. Дарэчы, адкрыццё першай чаргі трасы, якое адбылося два гады таму, таксама было прымеркавана да Дня народнага адзінства. І, як адзначыў кіраўнік адміністрацыі, будаўнікі абяцаюць і трэцюю чаргу пабудаваць да наступнай даты гэтага свята.**



— Мы традыцыйна прымяркоўваем знакавыя аб'екты да свят, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Пасля таго, як вуліца поўнасцю набудзе сваю закончанасць, кіраўніцтва горада і яго жыхары вырашаць, як яе назваць. Дарога звязвае некалькі мікрараёнаў Магілёва і служыць для таго, каб разгрузіць цэнтр, паляпшае магчымасці перамяшчэння на работу і з работы жыхарам горада.

Ігар Сергеенка нагадаў таксама пра сімвалічнасць і важнасць Дня народнага адзінства.

— Па сутнасці, гэта свята адроджана і аднаўлена, у яго аснову легла дата 17 верасня 1939 года, калі заходняя і ўсходняя часткі краіны злучыліся ў адзіную дзяржаву — Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку, — адзначыў ён. — Калі некалькі гадоў таму з'явілася ідэя абвесціць дату Дня народнага адзінства, выказваліся розныя меркаванні, але гісторыкі і грамадазнаўцы казалі, што ў нас яна ўжо ёсць — 17 верасня, трэба не толькі адрадзіць. Мэты мы сваёй дасягнулі, свята прыжываецца, яго ведае моладзь. Праводзяцца маштабныя мерапрыемствы па ўсёй краіне. Дзякуючы гэтаму адзінству мы сёння рэалізоўваем дзяржпраграму, у адпаведнасці з якой Магілёў з кожным годам становіцца ўсё больш прыгожым. Сёння мы маем магчымасць рэалізоўваць такія праекты, даводзіць пачатае да канца не толькі ў Магілёве, але і ў іншых рэгіёнах нашай краіны. Дзякуючы адзінству, ёсць магчымасць будаваць, ствараць, ісці далей. Вось у чым моц адзінства. Ствараючы эканамічны патэнцыял, мы тым самым абараняем сваю краіну.

Сігналам для адкрыцця дарожнага руху стаў момант, калі прадстаўнікі кіраўніцтва горада і вобласці разам з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта перавярнулі сімвалічны дарожны знак са становішча «праезд забаронены» ў «рух дазволены».

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** падкрэсліў значнасць падзеі:

— Гэта вельмі важны аб'ект. Па сутнасці, мы злучаем мінскі напрамак з нашым Задняпроўем. Але на гэтым не спыняемся. Налета дойдзем да ўязной аркі. Работы ўжо пачаліся. І я перакананы, што ўсю гэтую трасу цалкам будзем адкрываць на наступны год якраз на Дзень народнага адзінства. Паралельна пачалі будаўніцтва яшчэ адной транспартнай развязкі, мяркуем ад МДУ імя Куляшова выйсці адразу ж на праспект Міру.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота БелТА.**

# Ведаць, каб не трапіць у бяду

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аб месцах іх размяшчэння можна даведацца на сайце МНС — супрацоўнікі ведамства падрыхтавалі інтэрактыўную карту, а таксама спецыялізаваны раздзел з аўдыё- і відэанаглядна-выяўленчай прадукцыяй у дапамогу кіраўнікам і супрацоўнікам арганізацый.

— Асноўная мэта Адзінага дня бяспекі — прафілактыка надзвычайных сітуацый, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Акцэнт робіцца на адпрацоўцы эвакуацыі пры пажарах, бо гэта самая распаўсюджаная надзвычайная сітуацыя ў нашай краіне. Самае правільнае і галоўнае рашэнне пры ўзгаранні для любога грамадзяніна — пакінуць зону небяспекі: эвакуіравацца з памяшкання, дзе б ён ні быў. Будзе адпрацавана ўменне выкарыстоўваць першасныя сродкі пажаратушэння, супрацоўнікаў прадпрыемстваў, выкладчыкаў і навучэнцаў устаноў адукацыі, спецыялістаў аховы здароўя навучаць правільна карыстацца планамі эвакуацыі, аказанню першай медыцынскай дапамогі.

## «НЕ РЫЗЫКУЙЦЕ ЗДАРОЎЕМ І ЖЫЦЦЁМ»

Вядома, ратавальнікі заўсёды паспяхова і аператыўна спраўляюцца з вогненнай стыхіяй, але, разлічваючы на прафесіяналаў, нельга забываць і аб тым, што да прыбыцця ратавальнікаў можаш зрабіць ты. У першую чаргу дзеля таго, каб захаваць здароўе і жыццё сабе і сваім блізкім.

Практычна штодзень у асенне-зімовы перыяд фіксуюцца пажары, якія адбываюцца ў выніку няспраўных або няправільна эксплуатаваных печаў. У жылым фондзе асноўная колькасць узгаранняў, як правіла, прыпадае на ацяпляльны сезон. Гісторыі, калі гаспадары тапілі печ і ў выніку сталі ахвярамі агню, — на жаль, не рэдкасць.

Асноўныя патрабаванні пажарнай бяспекі, якія неабходна выконваць грамадзянам для выключэння пажару пры эксплуатацыі печаў, рэгламентаваныя правіламі пажарнай бяспекі.

Па-першае, катэгарычна забараняецца эксплуатаваць няспраўную печ. Яна павінна быць правільна складзеная і спраўная.

Па-другое, дымавую трубу печы перыядычна неабходна чысціць ад сажы: зыходзячы з умоў эксплуатацыі, але не радзей ад аднаго разу ў год. Ачыстка можа ажыццяўляцца як самастойна ўласнікам жылога дома, дзе размешчана печ, так і з прыцягненнем спецыялізаваных арганізацый.

Што рабіць, калі пажар адбыўся ў вас у кватэры ці ў прыватным доме? Калі вы бачыце, што самастойна з агнём не справіцеся, патэлефануйце ратавальнікам па тэлефоне 101 ці 112. Назавіце дыспетчару адрас, месца пажару, паведаміце аб наяўнасці ў будынку людзей, пагрозы найбліжэйшым будынкам. Рэальныя сітуацыі паказваюць, што нярэдка людзі, якія звяртаюцца ў службу ратавання, указваюць няправільны адрас. Часта блытаюць яго з уласным адрасам, выклікаючы падраздзяленні МНС бацькам. Таму будзьце ўважлівымі!

— Пры ўзнікненні пажару неадкладна пакіньце кватэру (хату), па магчымасці абясточце яе, адключыце газ, — рэкамендуе **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Шчыльна зачыніце дзверы ў памяшканні, якое гарыць, — гэта не дасць агню распаўсюдзіцца. Паведаміце аб пажары суседзям. Дапамажыце эвакуіравацца састарэлым і дзецям. Сустрэньце падраздзяленні МНС. Паведаміце, ці засталіся ў будынку людзі, удакладніце, што і дзе гарыць. Памятайце, што нельга вяртацца ў кватэру або хату, у якой пажар, па каштоўныя рэчы, дакументы. Не рызыкуйце вашым здароўем і жыццём!

## БЕЗ ПАНІКІ І МІТУСНІ

Небяспека можа чакаць чалавека і па-за ўласным жыллём. Рынак, гандлёвы цэнтр, рэстаран — месцы патэнцыяльнай небяспекі. Ратавальнікі рэкамендуюць выпрацаваць у сабе добрую звычку — вывучыць план эвакуацыі ў месцах з масавым знаходжаннем людзей, пракруціць у галаве алгарытм дзеянняў падчас пакідання будынка.

— Уваходзячы ў любое памяшканне з масавым зборам людзей, заўсёды запамінайце свой маршрут перамяшчэння на той выпадак, калі раптам паўстане неабходнасць хутка пакінуць будынак, — раіць **старшы інспектар сектара прапаганды Маскоўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях г. Мінска Таццяна ГАЛУШКА.** — Звяртайце ўвагу на эвакуацыйныя знакі і прытрымлівайцеся іх у выпадку надзвычайнай сітуацыі. Хутка вызначаць сваё месцазнаходжанне дапамогуць і такія арыенціры, як яркія шыльды, рэкламныя расцяжкі, крамы. Пагаварыце з дзецьмі аб тым, што ў выпадку надзвычайнай сітуацыі ні ў якім разе нельга хавацца.

Пах дыму або актывацыя сістэмы пажарнай сігналізацыі — сігнал, што трэба дзейнічаць. Не чакаць развіцця падзей, не спрабаваць упэўніцца, а неадкладна пакідаць будынак! Ратавальнікі не рэкамендуюць падымацца на верхнія паверхі і карыстацца ў час узгарання ліфтам: у любы момант можа адбыцца адключэнне электраэнергіі, і вы апынецеся ў пастцы, з якой сапраўды будзе цяжка выбрацца. Рухайцеся да выхаду хутка, але без мітусні, інакш пачнецца цісканіна. Арыентуйцеся на таблічкі, якія мігцяць, — яны пакажуць шлях эвакуацыі. Пры дрэннай бачнасці трымайцеся за сцены або поручні.

Пры пажары вельмі важна засцерагчы органы дыхання: таксічныя прадукты гарэння і вуглякіслы газ складаюць не меншую небяспеку, чым агонь. Прыкрыйце рот і нос рукавом адзення або любой вільготнай тканінай (можна намачыць вадой шалік, насоўку), прыгніцеся, бо ўнізе канцэнтрацыя дыму меншая. Ні ў якім разе не спрабуйце забраць пакінутыя ў камеры захоўвання рэчы: у такіх сітуацыях вы страціце час, а гэта можа каштаваць жыцця. Апынуўшыся ў натоўпе, не штурхайцеся, сагніце рукі ў локцях і прыцісніце іх да бакоў, сцісніце кулакі — такім чынам, вы зможаце прадухіліць здушванне грудной клеткі. Імкніцеся не спатыкнуцца, каб не зваліцца на падлогу, бо падняцца на ногі ў такой сітуацыі будзе вельмі праблематычна. Калі з вамі дзіця — трымайце яго моцна за руку.

У любой сітуацыі ратавальнікі рэкамендуюць не панікаваць і захоўваць спакой — паніка і мітусня заўсёды прыводзяць да неабдуманых учынкаў і пагаршаюць сітуацыю. Цвяроза ацэньваючы свае сілы, дапамагайце тым, хто побач, не перашкаджайце ратавальнікам выконваць сваю работу.

**Вераніка КАНЮТА.**

### КАЛІ ВЫ ПАЧУЛІ ГУК ПАЖАРНАЙ СІГНАЛІЗАЦЫІ:

— не панікуйце;
— пакіньце памяшканне па эвакуацыйных знаках;
— патэлефануйце па тэлефоне 112;
— выбірайце эвакуацыйныя выхады, якія знаходзяцца ў процілеглым баку ад дыму, ідзіце, прыгнуўшыся да падлогі і прыкрыўшы органы дыхання.

### КАЛІ ПАЧАЎСЯ ПАЖАР НА ПРАЦОЎНЫМ МЕСЦЫ:

— не панікуйце, патэлефануйце па тэлефоне 112;
— адключыце электрапрыборы;
— апавясціце аб пажары калег;
— па магчымасці скарыстайцеся вогнетушыцелем;
— пакіньце памяшканне.

Гучная справа

# МАГУТНАСЦЬ УЗРЫЎЧАТКІ — ЗВЫШ КІЛАГРАМА ТРАЦІЛУ

## КДБ затрымаў у Беларусі тры баявыя ячэйкі, якія працавалі на Службу бяспекі Украіны

**Рыхтаваліся тэракты на чыгунцы ў Стаўбцоўскім і Талачынскім раёнах. Пры затрыманні канфіскаваны ўзрыўчатка і дэтанатары. Пра гэта БелТА паведамілі ў Камітэце дзяржбяспекі.**

Пасля прадухілення спробы тэракту і абясшкоджвання злачынцаў у Стаўбцоўскім раёне сапёры ўзяліся за размініраванне выбуховага прыстасавання. У выніку магутнасць узрыўчаткі склала больш за кілаграм трацілу. Па заключэнні экспертаў, гэтага цалкам дастаткова для таго, каб пусціць пад адхон любы цягнік. Пра гэта заявілі на тэлеканале СТБ.

Адзін з фігурантаў, які рыхтаваў падрыў чыгункі ў Стаўбцоўскім раёне, ініцыятыўна выйшаў на сувязь з СБУ. Для падрыхтоўкі тэракту ён прыцягнуў свайго былога калегу. Ажыццявіць задуманае не ўдалося — іх затрымалі супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі.

Спробай падрыву чыгункі ў Талачынскім раёне кіраваў грамадзянін Украіны. Для здзяйснення тэракту ён прыцягнуў двух беларусаў, у якіх былі навыкі ў мінна-выбуховай справе. І ў гэтым выпадку трагедыю прадухілілі супрацоўнікі КДБ.

Акрамя таго, затрыманы грамадзянін Украіны, які незаконна перасёк беларускую граніцу, пакінуў на тэрыторыі нашай краіны цэлы арсенал з аўтаматамі Калашнікава, дронамі і ўзрыўчаткай. Усе затрыманыя змешчаны ў СІЗА КДБ, дзе даюць прызнальныя паказанні.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Назаруку Ігару Васілевічу, намесніку міністра замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні загадчыку кафедры інфекцыйных захворванняў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» доктару медыцынскіх навук, прафесару, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, народнаму ўрачу Беларусі Ігару Аляксандравічу Карпаву ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# Стаўка на кукурузу

## На Магілёўшчыне поўнай ходой ідзе ўборка кукурузы і сяўба азімых

**Паназіраць за ходам работ карэспандэнт «Звязды» адправілася ў калгас ААТ «Палыкавічы». На жаль, з-за засухі праблема са збожжавымі існуе па ўсім Магілёўскім раёне (і гэта гаспадарка не выключэнне), але кукуруза сёлета ўрадзіла. Едзем з галоўным аграномам Віктарам ЛУКАШЭВІЧАМ і яго памочніцай аграномам Ірынай МАСКАЛЁВАЙ назіраць за ўборкай.**





**Дырэктар ААТ «Палыкавічы» Аляксей ШУПЛЯКОЎ:**

— На жаль, тое, што планавалася сабраць, сёлета не атрымалі. Збожжа сабралі прыблізна 80 працэнтаў ад планаванага. Засуха паўплывала, якая прыйшлася на май і чэрвень. Пасеялі аднагадовыя культуры (пайзу, рэдзьку), каб дазбіраць кармы. Кукуруза сёлета нядрэнная, ужо закладзена звыш 6 тысяч тон сіласу. Да 1 кастрычніка і сяўбу азімых, і ўборку кукурузы павінны закончыць.

Работа на полі кіпіць.

— Плошчы ў нас вялікія, знаходзяцца на тэрыторыі трох сельсаветаў — Пашкаўскага, Палыкавіцкага і Мастоцкага: калі з аднаго канца ў другі ехаць, 40 кіламетраў атрымаецца, — кажа Віктар Лукашэвіч. — Найбольшы ўраджай апошнія пяць гадоў даюць азімыя. І акцэнт робіцца на іх. А вось яравыя пацярпелі ад засухі. Два месяцы дажджу не было. Я тут працую больш чым 20 гадоў, і такое засушлівае лета здарылася ўпершыню. Прычым спякота прыйшлася на май і чэрвень — месяцы, калі каласы павінны былі налівацца. Яны ж, наадварот, пагарэлі.

З яравых культур тут вырошчваюць ячмень, авёс, гарох палявы і кармавы, другі год запар эксперыментуюць з грэчкай. Яна, дарэчы, яшчэ не адцвіла. З азімых найлепшы ўраджай даюць пшаніца і ячмень. Мінулы год наогул быў цудоўны, а сёлета нават азімыя не парадавалі. Яны, канешне, захаваліся лепш, чым яравыя, але ўсё ж такі не так добра, як таго б хацелася.

Па дарозе аглядаем рапс «Северын». Галоўны аграном задаволены вынікам.

— Гэта культура, якая ідзе на тэхнічны алей і шрот на корм жывёле, — каментуе ён.

Кукуруза сёлета таксама вельмі прыгожая. Вырошчваем сорт «Палескі 212» на корм жывёле. У нас на ўтрыманні больш чым 5 тысяч галоў. Кукурузай засеялі каля 1150 гектараў. Улічваючы, што мы і шматгадовых траў недаатрымалі, гэтыя недахопы спаўна папаўняюцца сіласам.

Кукурузу ў гаспадарцы пачалі ўбіраць з 26 жніўня. Апрацавана яшчэ толькі трэцяя частка плошчаў, нарыхтавана больш чым 7 тысяч тон зялёнай масы.

Насустрач па кукурузным полі рухаецца кормаўборачны камбайн у пары з трактарам. Памочніца агранома Ірына Маскалёва расказвае пра свае галоўныя абавязкі. Адзін з іх — адсочваць якасць уборкі:

— Трэба, каб кукуруза, якую ўбірае кормаўборачны камбайн, грузілася ў кузаў і не сыпалася на зямлю. Каб не прастойвала тэхніка і быў пастаянны адвоз. Усё павінна працаваць зладжана.

**Механізатар Сяргей ШУЦКІ** на некалькі хвілін прыпыняе работу, каб пагутарыць з карэспандэнтам. Расказвае, што яго працоўны дзень у полі пачынаецца а сёмай гадзіне раніцы. Але на нагах ён ужо ў пяць. Ён жыве ў Новым Пашкаве ў прыватным доме, мае вялікую гаспадарку. Трэба сваю карову вывесці на пашу, астатнюю жывёлу дагледзець. А потым бегчы на работу, каб да сямі падрыхтаваць свой кормаўборачны камбайн «Палессе».

— КВК-800 мне падабаецца, раней на КЗР працаваў, таксама кормаўборачны камбайн, але ён меншы, — дзеліцца асаблівасцямі работы суразмоўнік. — На гэтым трэці сезон працую і вельмі задаволены. Тут і кандыцыянер ёсць, і халадзільнік. Усё цудоўна. Абеды па распарадку прывозяць. Кошт для нас мінімальны. Задавальненне атрымліваю і ад таго, што кукуруза сёлета вельмі добрая, высокая. Летась была горшая.

**Механізатар Віктар ГАЙКОЎ** задзейнічаны на адвозцы зялёнай масы. Прызнаецца, што для яго гэта звыклая справа. Уся яго працоўная дзейнасць звязаная з калгасам. Толькі раней працаваў у другой гаспадарцы — калгасе імя Валадарскага, які базіраваўся ў Пашкаве. Яго далучылі да ААТ «Палыкавічы». Трактар «Беларус-1221», на якім ён адвозіць сілас, падабаецца. Добрая тэхніка, кажа механізатар. А ён у гэтым пытанні спецыяліст. У розны час працаваў на машыне, аўтакране, цяпер вось — на трактары.





У гэтай мадэлі, праўда, кандыцыянера няма, ад спёкі ратаваўся з дапамогай замацаванага на працоўнай панэлі вентылятара. Гаспадарка паклапацілася. У спякотным маі-чэрвені работы шмат было. І культывавалі расліны, і арганіку ўносілі, і закрыццё вільгаці рабілі. Прыемна, што старанні не прайшлі дарэмна і кукуруза ўрадзіла.

У полі, дарэчы, даводзіцца працаваць ад сямі да сямі. Пакуль не да адпачынку. Трактарыст кажа, што ў рабоце трэба быць уважлівым і спрактыкаваным. Вось ён працуе ў пары з камбайнерам, і трэба глядзець, каб зялёная маса сыпалася непасрэдна ў кузаў. Гэтаму можна навучыцца, калі працуеш старанна і сумленна. Моладзь і тая хутка прыстасоўваецца. Калі трэба, вопытны трактарыст заўсёды падкажа. «Галоўнае, каб была цяга да тэхнікі і жаданне працаваць», — лічыць суразмоўнік.

— Чым больш мы кармоў нарыхтуем, тым большай будзе прадукцыйнасць і, адпаведна, зарплата, — адзначае ён. — Своечасова ўбяром і грошы ў тэрмін атрымаем. Як працуеш, так і зарабляеш.

Віктар Гайкоў радуецца, што ў такой паважанай газеце, як «Звязда», да юбілею будзе яго фота. Сваё 60-годдзе ён адзначыць у пятніцу.

Наступны наш прыпынак — сіласныя ямы. Гаспадарка іх нарыхтавала ўжо болей чым дзясятак. Пакуль едзем, галоўны аграном расказвае, што ў найбліжэйшых планах.

— Пасеялі 450 гектараў азімага рапсу, сеем 500 гектараў азімай пшаніцы, 400 гектараў азімага ячменю, 200 гектараў азімага жыта, а апошнюю чаргу прыступім да пасеву 700 гектараў азімага трыцікале, — пералічвае ён. — У панядзелак ішло актыўнае ўзворванне пад пасеў, уносіліся ўгнаенні, працавала сеялка «Беразіна 9600», якая захоплівае адразу 9,6 метра. Два трактары падрыхтоўвалі глебу да сяўбы. Тэхніка выключна беларуская, тэхналагічная. А вось надвор'е і цяпер не для кожнага віду работ спрыяльнае. Для ўборкі кукурузы добрае, а вось для пасеву — не. Суха, няма вільгаці.

Паралельна вядзецца ўборка саломы з палёў. У рабоце задзейнічаны два прэсы. Непадалёк ад адной з ферм назіраем за закладкай кармоў. Сіласныя ямы зроблены паўсюль, дзе ёсць фермы, у тым ліку ў Мастку, Пашкаве, Калінавай.

**Механізатар Дзмітрый СЕЛЯВАНАЎ** працуе на пагрузчыку «Амкадор», трамбуе сілас. Ён таксама хваліць кукурузу, адзначае, што сёлета пачалі яе прыбіраць нават раней. Работа звыклая, нічога складанага, асабліва для сельскага чалавека. Дома ў Дзмітрыя свая гаспадарка. Прызнаецца, што сёлета трыцікале і ячмень нават на яго дамашніх сотках не так добра ўрадзілі, як летась. Засуха не дала наліцца коласу.

— Праца цяжкая, маіх аднагрупнікаў па Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі з тых, хто застаўся ў прафесіі, можна на пальцах адной рукі пералічыць, — расказвае галоўны аграном. — Трэба любіць сваю прафесію. Яна нялёгкая, вынікі шмат ад чаго залежаць. Клімат мяняецца, але не так істотна, каб нешта кардынальна прыйшлося мяняць у рабоце. Але з культурамі крыху трэба эксперыментаваць. Сланечнікі ў суседняй гаспадарцы спрабавалі вырошчваць, але вынік не парадаваў. У Кіраўскім раёне вырошчваюць, але па пагодных умовах з Магілёвам у іх амаль тыдзень разбежка ў работах. Там сеюць, а тут яшчэ, умоўна кажучы, снег ляжыць. Цукровыя буракі (200 гектараў) вырошчваем і здаём на перапрацоўку.

Ну а першарадная наша задача — накарміць жывёлу. Каб былі канцэнтраваныя і травяністыя кармы, кукурузны сілас. Рапс прадалі, шрот купілі. Гэта бялок для дойнага статка. А значыць, малака будзе больш, і, адпаведна, грошай у гаспадаркі.



**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Магілёўскі раён.*

*(Пачатак тэмы на 1-й стар.)*



# ЯБЛЫЧНЫ СЕЗОН

## У сельгаспрадпрыемствах і фермерскіх гаспадарках Брэстчыны збіраюць садавіну

**Сады цяпер сустракаюць не толькі харастврм сакавітых пладоў, але і трывалым яблычным водарам. Прыйшла пара ўборкі ўраджаю. У Брэсцкай вобласці, якая дае больш за палову валавога збору яблыкаў у краіне, і гаспадаркі, і фермеры прыступілі да збору вітаміннай прадукцыі.**



Начальнік саду ААТ «Ружаны-Агра» Пружанскага раёна Вольга Гайдук сказала, што прамысловы сад у іх гаспадарцы займае 134 гектары, ён цалкам ахоплены сістэмай кропельнага паліву. Паводле слоў начальніцы саду, вырошчваюць у гаспадарцы толькі перспектыўныя, апрабаваныя сарты. Цяпер тут занятыя больш за два дзясяткі чалавек. Поўным ходам ідзе ўборка ранніх сартоў. Ураджай вязуць на закладку ў фруктасховішча. Частка яго адразу адгружаецца на рэалізацыю. Вольга Леанідаўна адзначае, што сёлета попыт на яблыкі вялікі, бо на прысядзібных участках, у адрозненне ад леташняга, яблыкаў няшмат.

У іншай гаспадарцы гэтага раёна — ААТ «Жураўлінае» — у фруктовым садзе збіраць ураджай пачалі перад выхаднымі. Самыя раннія сарты «кавalенкаўскі», «аўксіс», «беларускі салодкі» ўжо ўбралі і вывезлі ў фруктасховішча. Масавая ўборка разгорнецца на гэтым тыдні. Садаводы здымуць з галін раннюю зімовую «фрыду», за ёй настане чарга позніх сартоў «імант», «алеся» і іншых.



У сельгаспрадпрыемстве плануюць сабраць звыш тысячы тон яблыкаў. Цяперашняе надвор'е спрыяе якаснай уборцы. Адначасова са зборам ураджаю сельгаспрадпрыемства ладзіць гандаль вітамінная прадукцыяй. Смачныя яблыкі прадаюцца ў фірменных магазінах «Жураўлінага», адпускаюць іх пакупнікам побач з фруктасховішчам.

І яшчэ, як заўсёды, на гарачую пару ўборкі кіраўнікі сада «Жураўлінае» запрашаюць землякоў дапамагчы ў абмен на заробак і «жывыя вітаміны». Многія адклікаюцца.

Праблему рабочых рук на сезон уборкі ў садзе ААТ «Астрамечава» Брэсцкага раёна вырашаюць запрашэннем студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. У гэтыя дні там працуюць дзве брыгады студэнтаў гістарычнага факультэта.

— Для асенніх студатрадаўцаў гэта добрая нагода зарабіць грошай і крыху прадоўжыць летнія канікулы, — расказаў кіраўнік саду Віктар Пастухоў. — Даўняя практыка нашай гаспадаркі — запрашаць студэнтаў на час уборкі садавіны — сябе апраўдвае. Партнёрскія адносіны гаспадаркі з навучальнай установай працягваюцца шмат гадоў. Сёння штораніцы заступае на работу дзве брыгады па дзесяць чалавек. Студэнты забяспечваюцца гарачымі абедамі. Зарплатай яны, як правіла, застаюцца задаволеныя, працуюць добра. А ўсяго ў садзе кожны дзень працуе да сарака чалавек. Сабрана ўжо звыш 320 тон яблыкаў. І з кожным днём уборка набірае размах.

Сад у Астрамечаве займае 150 гектараў, правільней сказаць, тая яго частка, якая пладаносіць. Яшчэ на дзясятку гектараў падрастае малады сад. Сёлета раннія сарты пачалі ўбіраць яшчэ ў канцы жніўня. Усяго плануецца сабраць за сезон каля 2700 тон яблыкаў. Уборка будзе ісці да лістапада.

У астрамечаўскім садзе вырошчваецца паўтара дзясятка сартоў яблыкаў беларускай і замежнай селекцыі. Найлепшыя плады закладваюцца ў сховішчы, ідуць на продаж, іншыя накіроўваюцца на прамысловую перапрацоўку. «Астрамечава» традыцыйна адгружае вітамінную прадукцыю школам, садкам, частка пастаўляецца на экспарт.

Увесь сад гаспадаркі займае больш за дзве сотні гектараў. Акрамя яблыкаў тут вырошчваюць чарэшні, слівы, абрыкосы, алычу, вінаград. Кажуць, што хутка будзе вінаград. Яго пачнуць збіраць у верасні. Астрамечава мае сваю вытворчасць, тут выпускаюць не толькі яблычны, але і яблычна-вінаградны сок.

Самыя буйныя яблычныя плантацыі ў Брэсцкім раёне мае гаспадарка з адпаведнай назвай — ААТ «Аграсад «Світанне». Тут штогод збіраюць больш за чатыры тысячы тон пладоў. З кожнага гектара атрымліваюць звыш 300 тон яблыкаў. У стабілізацыйны фонд вобласці названае сельгаспрадпрыемства закладвае найбольшую колькасць пладоў. Аграсад прадае прадукцыю на асенніх кірмашах, пастаўляе ў розныя гандлёвыя арганізацыі.

Сад пастаянна абнаўляецца, старыя дрэвы выкарчоўваюць, вясной садзяць маладыя яблыні. Раней вырошчвалі некалькі дзясяткаў сартоў, цяпер спыніліся на некалькіх, што карыстаюцца найбольшым попытам у спажыўцоў. З беларускіх найбольш ахвотна ў вытворцаў купляюць «дарунак», «імант», «поспех», іх і вырошчваюць. Уборка нарошчвае тэмпы. Першыя партыі яблыкаў адгружаныя гандлёвым арганізацыям.

Як паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама, у 2022 годзе сельгасарганізацыямі і фермерскімі гаспадаркамі краіны атрымана 216,2 тысячы тон яблыкаў. З іх 122,8 тысячы тон (на 17,7 працэнта больш за ўзровень 2021 года) — на рахунку Брэсцкай вобласці.

У рэгіёне пад пладова-ягаднымі культурамі ў сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках занята 8029 гектараў. З іх 3762 гектары, альбо 47 працэнтаў, — у сельгасарганізацыях. У названыя плошчы, акрамя семечкавых культур, уваходзяць125 гектараў костачкавых культур і 2936 гектараў ягаднікаў.

Валавы збор пладоў і ягад у вобласці склаў летась 128,3 тысячы тон, што на 17,4 працэнта перавысіла ўзровень папярэдняга года. Сёлета плануецца сабраць не менш за мінулагодні ўзровень.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з адкрытых крыніц.**



# У бульбяным краі

## Гаспадаркі Віцебшчыны актыўна ўбіраюць другі хлеб

**Адным з першых у паўночным рэгіёне да ўборкі прыступіў Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі (ВЗІСГ) НАН Беларусі, у якім вырошчваюць 11 сартоў бульбы беларускай селекцыі ў сямі рэпрадукцыях.**

ВЗІСГ на Віцебшчыне з'яўляецца адзінай установай, дзе бульбу з высокімі якасцямі смаку размнажаюць мікракланальна на аснове найноўшых дасягненняў біятэхналогіі. Гэта па-навуковаму, простымі словамі — бульбу спецыялісты вырошчваюць у прабірках, што мінімізуе заражэнне караняплодаў вірусамі, а потым пераносяць чыстыя клубні на палі.

Сёлета віцебскія аграрыяў асабліва радуе ўраджайнасцю ружовы «маніфест», з гектара атрымліваюць па 30 тон караняплодаў. Гэты сорт вытрымаў выпрабаванні ў экстрэмальных умовах надвор'я, не паўплывала на вынік засуха. Сталовы сорт «маніфест» добра падыходзіць для смажання і варэння, даволі доўга не губляе свой унутраны крэмавы колер. Запатрабаваны на айчынным рынку і насенны матэрыял сартоў «брыз» і «скарб», усяго занальны інстытут штогод рэалізоўвае насельніцтву каля 300 тон бульбы. Астатні ўраджай накіроўваецца ў сельскагаспадарчыя прадпрыемствы паўночнага рэгіёна краіны, у гандлёвыя сеткі, установы адукацыі. Актыўна рэалізоўвае гародніну і фірменная крама інстытута «Аграрны», якая знаходзіцца ў аграгарадку Тулава Віцебскага раёна.

Пасля бульбакапальнага камбайна клубні перамяшчаюць у бульбасховішча. Там караняплоды праходзяць першую ачыстку, а пасля застаюцца на адаптацыю і ахаладжэнне на 14—20 дзён. Сарціроўка бульбы пачынаецца пасля таго, як лупіна памацнее.

Пад другі хлеб у Віцебскім занальным інстытуце сельскай гаспадаркі ў бягучым сезоне адведзена 42 гектары, уборку аграрыі ажыццяўляюць сваімі сіламі. Установа вядзе падтрымальную селекцыю і адначасова вучоныя шукаюць новыя сарты, якія падыходзяць пад кліматычныя ўмовы вобласці і спрыяюць павышэнню ўраджайнасці ў гаспадарках на 20—25 працэнтаў. У сваёй дзейнасці спецыялісты робяць акцэнт не на вялікім танажы, а на атрыманні якаснай насеннаводчай фракцыі. Захаванне тэхналогій на кожным этапе палявых работ — прыярытэтны напрамак дзейнасці навуковай арганізацыі, якая нясе адказнасць за якасны пасадачны матэрыял не толькі для віцебскіх гаспадарак, але і для ўсёй краіны. Вось і цяпер да рэалізацыі рыхтуюцца тры навінкі. Новыя сарты «умка» і «гарантыя» пакуль знаходзяцца ў цяпліцах, а ў гадавальніку папярэдняга размнажэння знаходзіцца «мастак», над якім віцебскія вучоныя працуюць ужо не першы год. Менавіта ВЗІСГ адным з першых на айчынным рынку пачне рэалізоўваць дадзены сярэднеранні сталовы сорт — ужо налета. А восенню інстытут прапануе насельніцтву сярэднеспелы «лель» — ён найбольш падыходзіць да перапрацоўкі на хрусткую бульбу, па-простаму — на бульбу фры. Дарэчы, на Талачынскім кансервавым заводзе ўжо актыўна працуе такая лінія вытворчасці, таму патрэба ў замежных аналагах фры ўжо не настолькі вялікая.

Як расказаў вучоны сакратар Віцебскага занальнага інстытута Алег Раўбіс, эксперыменты працягваюцца. Цяпер вучоныя працуюць над двума сартамі фіялетавай бульбы, якія аптымальна падыходзяць для лячэбнага дыетычнага харчавання.

Бульба — не адзіная культура, на якой спецыялізуецца аграрная ўстанова. Хлеберобам яшчэ трэба пасеяць каля 400 гектараў азімых пшаніцы, ячменю, жыта і трыцікале. Свяёй чаргі на ўборку чакае грэчка, яе тэрмін — канец верасня — пачатак кастрычніка.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витьбичи».**



# ЛЕТА — ЯК МАЛЕНЬКАЕ ЖЫЦЦЁ

**Што было — было: доктар, якога выклікалі да хворага хлопчыка, дома ў яго ўбачыў дзяўчынку. Спытаў:**
**— А ты, прыгажуня, што басячком на халодна падлозе? Вось прастудзішся, захварэеш і будзеш, як брацік...**
**Доктар потым агледзеў яго, выпісаў лекі, даў парады бацькам — сышоў. І толькі тут яны заўважылі,што малая па-ранейшаму без абутку.**
**— Чаму? Ты ж чула, што доктар сказаў? — спыталі ў яе.**
**Дзяўчынка хіба ўсміхнулася (ну яшчэ б!):**
**— Доктар сказаў, што я прыгажуня!**

**...Ім, то-бок нам (і не толькі прыгажуням), уласціва помніць тое, што прыемна альбо важна (ці толькі здаецца?), тое, што смешна ці крыўдна, што зусім нечакана і чакана, тое, што пачулі спачатку альбо ў канцы...**
**Кожны помніць сваё.**

## СКЛАДАНАСЦІ ПЕРАКЛАДУ

Лета — гарачая пара ў вяскоўцаў: на сяўбе, на ўборцы людзі працуюць ад цямна да цямна, што добра — там жа, на месцы, харчуюцца.

У газетным рэпартажы на тэму досыць падрабязна распісана, што канкрэтна ім гатуюць, як дастаўляюць.

Адтуль, з газеты, амаль даслоўнае: у машыне, апроч саміх абедаў, едуць стол, крэслы, спецыяльны парасон ад сонца, аднаразовы посуд, металічныя ложкі.

Для тых, хто забыўся: рускае слова «ложка» — гэта тое, чым ядуць, беларускае — ложка (ложак) — тое, на чым спяць. Што, згадзіцеся, цалкам лагічна: пасля добрага абеду па законе Архімеда...

Поле ўявілася (пакуль не зжатае), на ім — камбайны-грузавікі, рад «металічных ложкаў»: людзі спяць.

...Ім, напэўна, добра было б — у полі, пад высокім небам?

А нам?

## НАВАТВОР

Дача — гэта месца, дзе саджанец становіцца дрэвам, семечка — гароднінай, а чалавек ракам, бо ўсё лета змагаецца — то з пустазеллем, то з кратамі і мурашамі, то з засухай, тлёй, драздамі, якія так і палююць на вішні, чарэшні, клубніцы, парэчкі. У лесе ні суніц, ні чарніц не было, дык хоць нешта, спадзяваліся, дома?!

— Вой, а ў вас гэта што — буйніцы?! — радуецца свячка ля куста буякоў.

...Мову стварае народ.

## СЛЕДАМ

Урок беларускай: нашы суседзі-расіяне ходзяць *за* (*за* грыбамі, *за* вадой, *за* справкой в ГАИ, в детский сад *за* сыном)...

Беларусы ходзяць *у* альбо *па* — *у* грыбы, *у* ягады, *па* хлеб, *па* ваду, *па* лекі, *па* дзяўчыну...

ЗА ёй (той дзяўчынай альбо некім іншым), можна хадзіць таксама, але гэта азначае *следам*...

Прыклад (каб запомніць)? Ды калі ласка!

Горад, метро. На ім мы даязджаем да патрэбнай станцыі, выходзім, па шырокіх прыступках падымаемся ўверх — следам за дзяўчынай у, мякка кажучы, кароткай маленькай спадніцы і (мода!) вялізных грувастких чаравіках.

З адным — відаць, нешта-нейкае сталася (шнурок развязаўся, ці што?), дзяўчына згінаецца, каб яго завязаць...

Карціна алеем.

## ТРЭБА

Гадоў да трох гэтае дзіця маўчала. Дакладней, гаварыла, але ж вельмі няшмат: «мама», «тата», «цыца», «дай»... Звычныя слоўкі.

І адно — нязвыклае: калі малому нешта падабалася, ён пляскаў у ладкі з кароткім: «Ай-ай!»

«Ай-ай!» — на любімую кашку і кошку, на новую цацку і адзежынку, на мульцік і малюнак у кніжцы...

Вырас цяпер, жаніўся. А вось бацькі — якраз наадварот: разышліся і нават раз'ехаліся. Маці ў горадзе жыве, бацька — у сезон на лецішчы.

...Дамок там сёлета падладзіў: на мансардзе акенца замяніў, пафарбаваў сцены. Прыгожа атрымалася!

Каб палюбавацца, гаспадар паводдаль стаяў — курыў, магчыма, чакаў, але «ай-ай!» не сказаў ніхто.

А трэба было б!

І хацелася!

## СЫН АД ПЕРШАГА ШЛЮБУ

...Спачатку яна закахалася — як належыць, без памяці — і толькі потым пачула, што яе абраннік быў жанаты, што ў яго ёсць сын, што рашэннем суда малога пакінулі з досыць шалапутнай мамай, якой патрэбныя аліменты, а дзіця — пастолькі, паколькі, і таму яго часцяком «падкідалі», прывозілі бацьку.

Той з ахвотай прымаў і спраўляўся — спачатку адзін, а ўжо з Таняй — і пагатоў: ледзь не адразу малы прызнаў яе за сваю — Матай назваў (мамай Таняй, значыць).

А яна і рада была — шкадавала дзіця: на яго, нярodнае, знаходзіла час і тады, калі родных не было, і тады, калі яны з'явіліся (двое), і тады, калі з усімі трыма — засталася адна (муж рана памёр). Дзеці — гэтак жа «рана» — выраслі.

Што цікава, абодва малодшыя жывуць за мяжой. Тут, паблізу, толькі старэйшы: па магчымасці адгукаецца, дапамагае ёй — і дома, і на дачы...

Яна яму — стараецца таксама, бо як ні круці — Мата. І ўжо нават Бата: у сына ад першага шлюбу — сын, і яна — нібыта бабуля.

## ГЭТА МЫ

Раніца, трамвай. Што добра — ён жвавенька бяжыць па рэйках, вязе; што не вельмі — спыняецца на чарговым павароце і стаіць — мінуту, дзве, тры... Колькі яшчэ, — ніхто нічога не кажа... Дзверы між тым адчыненыя.

Хтосьці, відаць, знерваваны, з салона выходзіць першы, за ім, як па камандзе, кіруюць іншыя — ледзь не ўсе, пасля чаго дзверы ў трамваі зачыняюцца — ён крануецца з месца, едзе...

Што гучыць яму ўслед, ні кіроўца, ні жменька пасажыраў не чуюць...

А можа, і чуць там няма чаго, бо абурацца, уголас, а тым больш па драбязе — гэта ж не наша?

## ЭХ, РАНА, РАНА... І ПОЗНА, ПОЗНА?

Горад, вуліца, дом. Тут, на сёмым паверсе, некалі жыў Максімавіч — з каханай жанчынай, з дзецьмі, якімі так ганарыўся! Ну як жа: абое — медалісты, у абаіх — чырвоныя дыпломы прэстыжных «універаў», сем'і, асобныя кватэры...

Бяда прыйшла, адкуль падумаць не мог: сын — такі паспяховы, разумны, прыгожы — стаў выпіваць, потым — запіваць і паціху прапіваць усё. За нейкіх пару гадоў, азірнуцца не паспеў, як застаўся без жонкі і дзіцяці, без работы, без жытла (заснуў з цыгаркай — загарэлася канапа...). А ўжо колькі нерваў спаліў сваім блізкім!

«Я ў сям'і — самы здаровы», — пасля другога інфаркту казаў пра сябе Максімавіч і, як выглядала, чыстую праўду, бо ў дачкі (яна вельмі любіла брата!) на той час была астма, у жонкі — цукровы дыябет і анкалогія, у сына — алкагалізм, які не паддаваўся ніякаму лячэнню, і ўрэшце...

— Ён нейкай атруты глынуў — пад выглядам гарэлкі, — сказала потым суседка і, цяжка ўздыхнуўшы, дадала: «Памёр...» І ўсе задыхалі вальней, падумалі, каб гэта — ды раней!.. Можа, родныя былі б здаровыя?

## ПАД УРАЖАННЕМ

Анекдот адным радком: храпу — найбольш баяцца ў моргу, паталагаанатамы.

І каб толькі!

...З кожным годам усё лепшыя тэлевізары і ўсё горшая якасць перадач. Але ж зрэдку пакуль шыеш-гатуеш-прасуеш — нешта глядзіш.

Днямі — у «паўвока» — чарговы бандыцкі фільм.

Пасля яго, пад уражаннем, толькі з трэцяга разу сцяміла, што кніжка, забытая некім на канапе, называецца «Цені ў моры», а не ў... моргу.

## НА ЎНУКАЎ НЕ СПАДЗЯВАЙСЯ?

...Даражэйшых помнікаў на тых могілках шмат, прыгажэйшых, — здаецца, не было? З доўгіх шэрагаў іншых — гэты вось (твор мастацтва — не інакш!) — вылучаўся зграбнасцю і светласцю каменю, нейкай паветранай лёгкасцю і... урачыстасцю: здалёк здавалася, што ў пахаваных бацькоў — ці не дзесяць дзяцей, што жывуць паблізу і ледзь не штодня прыходзяць...

Па праўдзе ж — «Памяць дачкі і ўнукаў».

...Кажуць, яна, тая дачка, апошнім часам хварэе, бо на могілках не была даўно.

Помнік за гэты час пацямнеў ад гразі і ледзь не схаваўся ў сумніку.

Страшнае пустазелле.

Яшчэ і назваў.

## ТАК БЫЛО, ТАК ЁСЦЬ

Некалі ці не ўсе ганяліся за кнігамі: куплялі, чыталі — гарталі старонкі, цяпер — найчасцей — хіба тэлеканалы...

На нейкім — кіно (замежнае). Адтуль — эпізод: у 30-ы дзень нараджэння дзяўчына прыязджае да матулі з бабуляй, яны разам сядзяць за святочным сталом у гасцёўні, сцены якой абвешаны здымкамі. На адным — старым — прапрабабуля імянінніцы і пры ёй — у тыя ж трыццаць — муж і васьмёра дзяцей, на другім — прабабуля: побач з ёй — шасцёра; у бабулі, што сядзіць за сталом, было чацвёра, у матулі — двое... Госця — нават не замужам...

Замежнае кіно, а карціна — амаль тутэйшая.

## «РЭПЕТЫЦЫЯ»

Яна ў сорак (з хвосцікам) выглядала, можа, на трыццаць, ён — наадварот. Але ж гэта яны заўважылі потым. А тады...

Сонейка, мора, пляж — доўгачаканы водпуск. І падчас яго, як здавалася, так дарэчы маленькі курортны раман...

Вось толькі з «памерамі» яны «прамахнуліся»: думалі, раз'едуцца па дамах, па сваіх гарадах, і ўсё скончыцца, а выйшла інакш: ледзь не кожны дзень названьвалі адно аднаму; ён «моду ўзяў» прыязджаць — на выхадныя, на святы альбо яе да сябе выцягваць... Ну чаму б і не, калі разам добра, калі абое — людзі вольныя (у разводзе). А вось так у іх — «як бы» шлюб, гасцявы...

Мог бы стаць і сапраўдным — ён прапаноўваў. Гэта яна адмаўлялася, гэта яна баялася і «хавалася» то за дзяцей, яшчэ не ўладкаваных, то за маці, як быццам старую і вельмі хворую...

Бо галоўнай прычынай быў злашчасны ўзрост: жаніху на адзінаццаць гадоў менш. Значыць, не сёння заўтра ў яго, далёка не бедная (толькі вокам міргні!), можа з'явіцца іншая, куды маладзейшая і прыгажэйшая... Ёй не хацелася быць пакінутай (да таго ж — яшчэ раз)...

А ён, падобна, і не збіраўся яе кідаць: не так даўно чарговую прапанову зрабіў, больш за тое — зmусіў яе не проста падумаць, а пераехаць да яго і пажыць.

Яна згадзілася — на «рэпетыцыю» — і два тыдні пражыла ў час водпуску. Больш, як прызналася, проста не змагла.

Не змагла многае. Ну, па-першае («хоць салому еш, ды фасону не губляй»), днямі хадзіць на абцасах і без акуляраў; мераць ціск крадком, піць таблеткі тым жа, прачынацца нашмат раней, каб не ўбачыў без прычоскі і макіяжу, спаць у непрывычнай піжаме...

— А дома — ну як ажыла! — казала са смехам. — Прыехала, у ванну залезла, выкупалася, потым халат на плечы, ручнік на галаву — і на канапу... Ну які ўжо «замуж»? Дзе мне можа быць лепей?!

...Продкі, мусіць, праўду казалі: «Еш з голаду, любі — змоладу».

Ды ці ўсім на гэта пашчасціць.



## З НАДЗЕЯЙ

Крама, вечар і чарга да касы. Маладзіца, што стаіць наперадзе, гаворыць па мабільным — падобна, з мужам, падобна, даўно, але ж нарэшце — пра самае важнае:

— Ты ж маму з цягніка сустрэнеш?.. Ну глядзі — не спазніся, лепш загадзя прыедзь... Сумкі паднясі, каб яна не цягнула. І не маўчы ж там — пагавары: спытай, як даехала, як здароўе, што нова-га, а дома — пачастуй, я ўсё падрыхтавала. І вінца налі...

Заключная фраза:

— Можа, грошай дасць?..

Яўрэйская мудрасць: з грашыма не гэтак добра, як дрэнна без іх. Асабліва цяпер, маладым.

Анекдот (трэба разумець, ад некага з іх?): грошай мне можа хапіць да самай смерці, калі я пamру сёння, да абеду).

## КАБ ВЕДАЛІ...

Горад, майстэрня, надпіс на сцяне:

«Хочаш дапамагчы малому — зрабі разам з ім.

Хочаш дапамагчы старому — зрабі замест яго.

Хочаш дапамагчы майстру — не замінай.

Хочаш дапамагчы дурню — сам такі».

Як быццам нічога ў тым нова-га — прапісныя ісціны. Але ж нехта іх «прапісаў»?

І тым самым хоць некага ды «ўзброіў» — такім простым — на першы погляд — мастацтвам жыць.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** (і не толькі):

*«Твая цяжкая работа — мара кожнага беспрацоўнага. Твае непаслухмяныя дзіця — мара кожнага бяздзетнага. Твой невялікі капітал — мара кожнага, хто ў даўгах. Тваё неважнецкае здароўе — мара кожнага невылечна хворага. Тое, што ўсявышні хавае твае грахі ад людскіх вачэй, — мара кожнага, хто зганьбіў сябе дрэннымі ўчынкамі. Твой спакойны сон, твая даступная ежа — мара кожнага, у каго ў краіне ідзе вайна. Трэба цаніць усё, што маеш, бо...*

*Ніхто не ведае, што з табой будзе заўтра».*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
13 верасня 2023 г. № 33 (719)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ВАЖНАЯ І ПАТРЭБНАЯ СПРАВА

**Упершыню ў Беларусі адразу траім дзецям, якія нарадзіліся з рэдкім генетычным захворваннем — спінальнай мышачнай атрафіяй (СМА), — увялі самы дарагі прэпарат у свеце «Золгенсма». Апошняе стала магчымым пасля звароту маці гэтых дзяцей у Савет Рэспублікі. Да збору сродкаў далучылася ўся краіна. З мамамі малых у РНПЦ «Маці і дзіця» сустрэлася Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**







Фота БелТА.

Прэпарат маленькім пацыентам увялі 9 верасня. Перад гэтым спецыялісты прайшлі навучанне. Цяпер малыя знаходзяцца пад назіраннем.

«Такіх гісторый дастаткова шмат у нашай краіне, — адзначыла спікер верхняй палаты парламента. — Я шчыра хацела б падзякаваць усім, хто мае дачыненне да гэтай вялікай справы. Мы разам змаглі зрабіць вельмі важную і патрэбную справу для асобна ўзятай сям'і. Гэта сведчыць аб міласэрнасці, спагадзе нашых людзей. Падключыліся кіраўнікі прадпрыемстваў, працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі. Падключыліся ўсе людзі добрай волі, якія сабраліся і набылі такія прэпараты, якія, я ўпэўненая, дапамогуць гэтым дзеткам».

Наталля Качанава назвала сімвалічным, што напярэдадні Дня народнага адзінства мы можам зрабіць вельмі важныя і патрэбныя справы не толькі для ўсёй краіны, але і для асобна ўзятага чалавека, асобна ўзятай сям'і, асобна ўзятага дзіцяці.

Усяго ў Беларусі генна-замяшчальную тэрапію атрымалі шасцёра дзяцей. «Аб першых трох ужо можна сказаць, што ёсць станоўчы эфект», — удакладніў **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — РНПЦ «Маці і дзіця» з'яўляецца сертыфікаваным цэнтрам, і толькі ён можа ўводзіць такія прэпараты. Больш за тое, гэта адзін з нямногіх цэнтраў, сертыфікаваных на постсавецкай прасторы. Таму тут можа аказвацца дапамога дзеткам і з іншых краін, якім могуць увесці гэтыя прэпараты».

Па словах кіраўніка ведамства, усе дзеці, якім уведзены прэпарат, знаходзяцца на кантролі. «У іх захворванні розная ступені цяжкасці, таму кожнаму з іх праводзіцца асобна ўзятая тэрапія», — дапоўніў Дзмітрый Піневіч.

Спікер падкрэсліла, што ў Савеце Рэспублікі зваротам грамадзян удзяляецца асаблівая ўвага. «Мы робім зрэз зваротаў грамадзян і стараемся ніводны з іх не пакідаць без разгляду, асабліва гэта датычыцца пытанняў здароўя. Вы бачыце, якую ўвагу пытанням аховы здароўя ўдзяляе Прэзідэнт. Ад гэтага залежыць жыццё чалавека і ў цэлым дабрабыт сям'і. Што можа быць важней для чалавека, чым дзеці і сям'я. Для нас вельмі важна, каб былі сем'і, каб былі ў дзяцей бацькі, каб яны маглі атрымліваць усе выгоды ў сваёй краіне, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы актыўна заняліся дзеткамі з аўтызмам, сіндромам гіперактыўнасці. Праблема ёсць, і досыць шмат такіх дзяцей. Разам збіраемся і абмяркоўваем гэтыя пытанні».

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Магчымасці павышэння эфектыўнасці воднай гаспадаркі

**абмеркавалі на нарадзе пад начылам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ**

**Тэма мерапрыемства, прысвечанага пытанням эфектыўнасці функцыянавання водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Беларусі, не новая. Яна неаднаразова абмяркоўвалася на сустрэчах розных узроўняў. Забеспячэнне насельніцтва якаснай пітной вадой і роля ўрада і органаў мясцовай улады ў выкананні гэтай задачы сталі асноўнымі пытаннямі абмеркавання. Удзельнікі нарады сышліся ў поглядах аб неабходнасці максімальна абагуліць станоўчы вопыт пэўных рэгіёнаў у развіцці воднай гаспадаркі, каб маштабаваць яго ў рамках краіны, аднак пры гэтым адштурхоўвацца ад спецыфікі дакладнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.**

Паўтара месяца таму на сустрэчы з урадам, Камітэтам дзяржкантролю ўжо абмяркоўвалася тэма структуры работы ЖКГ, у прыватнасці цэнтралізацыі сістэм водаканалаў, якія функцыянуюць у кожным раёне і горадзе. Тады ўдзельнікі не прыйшлі да адзінага меркавання і дамовіліся сустрэцца яшчэ раз, папярэдне папрацаваўшы па гэтай тэме з калегамі ў рэгіёнах, нагадала Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталлі Качанавай неаднаразова даводзілася чуць меркаванні і просьбы людзей наконт воднай гаспадаркі падчас прыёмаў і сустрэч.

— Сістэма водазабеспячэння і водаадвядзення розная ў кожным раёне і горадзе. І тут сапраўды павінны прымаць рашэнні мясцовыя органы ўлады, і падыходы павінны быць рознымі. Магчыма, павінна быць цэнтралізацыя ў межах некалькіх раёнаў, — выказала меркаванне спікер, падкрэсліўшы, што немагчыма пакінуць такія звароты людзей без увагі.

Развіццё воднай гаспадаркі мае важнае значэнне для якасці і камфорту жыцця грамадзян, заўважыў **Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, старшыня Наваполацкага гарвыканкама:** «Удзельнікі нарады сышліся ў меркаванні, што забеспячэнне людзей якаснай і чыстай пітной вадой — задача мясцовых органаў улады, якія, як абазначыў Прэзідэнт, павінны разумець і выконваць пастаўленыя задачы і валодаць неабходнымі сродкамі і магчымасцямі для гэтага. Формы і метады гэтай работы залежаць ад спецыфікі пэўнага рэгіёна».

На нарадзе прагучалі розныя меркаванні ад кіраўнікоў аблвыканкамаў наконт таго, як павінна развівацца водаправодна-каналізацыйная гаспадарка, аднак кожны рэгіён мае свой шлях развіцця ў гэтай частцы, падкрэсліў **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА:**

— Віцебская і Гомельская вобласці, у прыватнасці, зрабілі цэнтралізаваную сістэму. Ёсць раёны, дзе водазабеспячэннем займаюцца і комплексныя прадпрыемствы ЖКГ, і прафесійныя водаканалы. Каб водаправодна-каналізацыйная гаспадарка краіны дынамічна развівалася, будуюцца станцыі абезжалезвання (сёлета іх павінна з'явіцца 147), рэканструююцца ачышчальныя збудаванні. Шлях развіцця воднай сферы вызначаны да 2025 года.

**Ірына СІДАРОК.**

# БЕЛАРУСЬ — УЗБЕКІСТАН: НОВАЯ СТАРОНКА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Гэтае найважнейшае мерапрыемства, якое па запрашэнні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу праходзіла ў рамках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Узбекістана на чале са спікерам Сената Олій Мажліса Танзілой Нарбаевай, — ужо гісторыя. Аднак дамоўленасці, аб якіх вялася размова падчас бізнес-форуму, — тое, над чым у найбліжэйшы час будуць працаваць і беларусы, і ўзбекі. Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум адкрыў новыя магчымасці для дынамічнага росту двухбаковых адносін. Прычым не толькі ў эканамічнай сферы, але і па многіх іншых кірунках жыццядзейнасці.**



Аб гэтым сведчаць 14 падпісаных мемарандумаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве. Сярод іх — мемарандумы аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Беларусь і Сенатам Олій Мажліса Узбекістана, паміж грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз жанчын» і Камітэтам сям'і і жанчын пры Міністэрстве занятасці і скарачэння беднасці Узбекістана, паміж Маладзёжным саветам пры Нацыянальным сходзе і Маладзёжным парламентам пры Сенаце Олій Мажліса. Акрамя таго, заключана 15 камерцыйных кантрактаў на суму звыш 93,5 мільёна беларускіх рублёў.



Узаемавыгадныя кірункі супрацоўніцтва абмяркоўваліся падчас шасці секцыйных пасяджэнняў. Аб тым, што канкрэтна цікавіць беларусаў ва Узбекістане і, наадварот, чым мы можам быць карыснымі сваім партнёрам, гаварылася падчас пленарнага пасяджэння бізнес-форуму «Жанчыны ў бізнесе — патэнцыял для развіцця дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана».

## Каля паўтысячы нашых трактароў паедзе ва Узбекістан

Па аб'ёме тавараабароту Узбекістан уваходзіць у дзясятку нашых краін-партнёраў і займае сёмае месца ў экспарце Беларусі. Яго аснову складаюць мяса-малочная прадукцыя, тавары з дрэва, фармацэўтычныя прадукты, трактары і інш. У прыярытэце імпарту тавараў з Узбекістана — прадукцыя лёгкай прамысловасці, агародніна, садавіна, медны дрот і трубы.

У Беларусі функцыянуе 84 арганізацыі з узбекскім капіталам у галіне вытворчасці спецаўтатэхнікі, трактароў і абутку. Ва Узбекістане зарэгістравана больш за 100 прадпрыемстваў, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца рэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Функцыянуе прадстаўніцтва кампаній у сферы міжнародных перавозак, распрацоўкі праграмнага забеспячэння, вытворчасці лекавых сродкаў і ветпрэпаратаў. У 2022 годзе ў Ташкенце адкрылася сумеснае прадпрыемства па вытворчасці малочнай прадукцыі. Ёсць дамоўленасці аб стварэнні новых вытворчасцяў і пашырэнні наменклатуры ўзаемнага гандлю.

Узбекістан уваходзіць у чацвёрку сусветных лідараў па запасах золата, з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам медзі ў рэгіёне, мае запасы вугалю, нафты, прыроднага газу, апераджае многія краіны па вырошчванні бавоўны, агародніны і садавіны. Як перакананы **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ**, для вытворчасці прадукцыі з такой разнастайнай сыравіны патрэбны тэхніка, сучасныя тэхналогіі, годны ўзровень адукацыі спецыялістаў. «Па многіх кірунках Беларусь валодае кампетэнцыямі і патэнцыялам і гатова да актыўнага супрацоўніцтва, — падкрэсліў ён. — Наша кар'ерная тэхніка ўжо сёння працуе на ўзбекскіх радовішчах. Мы бачым, што прыкметны патэнцыял засяроджаны ў вытворчасці і пастаўцы трактароў. Гатовы разгледзець пытанне аб вытворчасці беларускіх трактароў ва Узбекістане з лакалізацыяй камплектуючых для іх».

Аб тым, што беларускія трактары сапраўды патрэбны ва Узбекістане, сведчыць адпаведны кантракт, падпісаны падчас Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму. Мінскі трактарны завод пастave у гэтую краіну каля 500 трактароў на суму звыш васьмі мільёнаў долараў. Пастаўкі прадукцыі прадпрыемстваў-гігантаў (МАЗа, БЕЛАЗа), электратранспарту, дрэваапрацоўкі, шын, лакафарбавых матэрыялаў, нарошчванне экспарту спажывецкай тэхнікі — гэта далёка не ўсе магчымасці беларуска-ўзбекскага партнёрства.

«Задзел на далейшае развіццё супрацоўніцтва створаны вялікі, — кажучы аб гандлёва-эканамічным узаемадзеянні дзвюх краін, рэзюмаваў Аляксандр Чарвякоў. — Трэба знаходзіць сферы агульных інтарэсаў у эканоміцы, палітыцы і сацыяльнай сферы. Ужо сёння гэтыя напрамкі вызначаны, трэба іх толькі далей развіваць».

## Беларускія тканіны — узбекскі пашыў

Яшчэ адзін кірунак беларуска-ўзбекскага ўзаемадзеяння — кааперацыя ў сферы лёгкай прамысловасці. Узбекістан валодае вялікай сыравіннай базай для развіцця вытворчасцяў, беларусы гатовы падзяліцца тэхналогіямі. У найбліжэйшы час з трыкатажнага палатна, створанага ў Беларусі, ва Узбекістане па нашых лякалах і дызайне будуць шыць адзенне, у тым ліку школьную форму. Акрамя таго, падпісана пагадненне аб намеры стварэння сумеснага прадпрыемства па вырабе аўчынна-футравай, каракулева-смушкавай, пушна-футравай сыравіны паміж Furskins Company і «Марка». Такі вопыт ужо ёсць.

«З 2018 года холдынг «Марка» працуе з адной з узбекскіх кампаній — сумеснае прадпрыемства па перашыву абутку, — расказала **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА**. — Ужо выпушчана каля 250 тысяч пар, але і гэта не мяжа. Мы разлічваем нарасціць выпуск да мільёнаў пар абутку. І паколькі аўчына ў Беларусі запатрабавана для вырабу падкладкі і вусцілкі на зімовы абутак, а ў нас гэтага віду сыравіны няма, вельмі важна ўступіць у прамысловую кааперацыю для таго, каб заматываваць адзін і другі бок у частцы якасці, тэхнічнага складальніка і бізнесу».

Па меркаванні старшыні канцэрна, фармат прамысловай кааперацыі цяпер з'яўляецца вельмі актуальным. «Каб увязаць партнёра на больш доўгую і сумленную работу, лепш уваходзіць у бізнес-працэс прамысловай кааперацыі, — лічыць Таццяна Лугіна. — Сёння ты прадаў аднаму, заўтра — другому. Спачатку партнёр зацікаўлены ў табе, а на наступны дзень — у іншым. А калі ты ўступаеш у тэхналагічныя працэсы, наладжваеш абсталяванне, прапісваеш у дагаворы, што мы абменьваемся не толькі дамовамі, але і кампетэнцыямі, работа ідзе больш прадуктыўна».

Па такім прынцыпе са студзеня 2023 года ўжо працуе кампанія «Мілавіца». Пашыў нашай бялізны ажыццяўляецца на адным з прадпрыемстваў Ташкента. Яго дырэктар



## Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум завяршыўся ўзаемавыгаднымі кантрактамі і ўзмацненнем сяброўскіх адносін

пацвердзіла намеры супрацоўніцтва з «Мілавіцай» на доўгія гады.

### Ад кадраў да фармацэўтыкі

Ключавымі кірункамі супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў сферы аховы здароўя з'яўляюцца фармацэўтыка, трансфузійная дапамога, узаемаадносіны паміж установамі аховы здароўя, а таксама медыцынская адукацыя. Супрацоўніцтва наладжана паміж Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам і Андыжанскім дзяржаўным медыцынскім інстытутам, Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам і Бухарскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам. Працягваецца супрацоўніцтва паміж БелМАПА і Ташкенцкай медыцынскай акадэміяй, Ташкенцкім стаматалагічным інстытутам. У медыцынскіх ВНУ вучацца студэнты з Узбекістана. Добрыя ўзаемаадносіны наладжаны і паміж установамі аховы здароўя. У прыватнасці, летась у РНПЦ «Маці і дзіця» праведзена навучанне чатырох урачоўнеанатолагаў з Узбекістана, сёлета — 18 спецыялістаў. Колькасць тых, хто мае патрэбу ў навучанні або павышэнні кваліфікацыі, будзе павялічвацца.

Што датычыцца супрацоўніцтва ў галіне фармацэўтыкі, размова ідзе аб сумеснай вытворчасці лекавых прэпаратаў, імпарце прэпаратаў з Узбекістана і экспарце беларускіх прэпаратаў. Яшчэ адзін кірунак — развіццё трансфузійнай дапамогі, а таксама вытворчасць прэпаратаў з плазмы крыві. Узбекскія медыкі жадаюць пераняць вопыт беларусаў у пытанні аказання высокатэхналагічнай дапамогі анкалагічным пацыентам, у першую чаргу дзецям.

Як расказаў **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ**, ва Узбекістане прымаюцца меры для стварэння навукова-практычных цэнтраў, выбудоўваецца сістэма медыцынскай дапамогі — пачынаючы ад першаснага звяна і заканчваючы буйнымі высокатэхналагічнымі цэнтрамі, дзе сканцэнтраваны навуковы патэнцыял, сучаснае абсталяванне. У гэтым плане, па яго словах, вопыт Беларусі будзе карысны.

### Патэнцыял, цікавы абедзвюм краінам

З будучымі партнёрамі падчас бізнес-форуму вызначыліся і бізнес-лэдзі, якія займаюцца сельскай гаспадаркай. Падчас наведвання ААТ «Азярыцкі-Агра» прадпрымальніцы з абедзвюх краін абмеркавалі шляхі супрацоўніцтва ў аграпрамысловым комплексе.

Канкрэтныя дамоўленасці ўжо ёсць і ў сферы навукі і адукацыі. І гэта не новы напрамак супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам. Наладжана супрацоўніцтва паміж універсітэтамі, у межах якіх адбываецца абмен студэнтамі і выкладчыкамі. Рэалізоўваюцца адукацыйныя, навуковыя праекты.

Новыя вектары набывае і партнёрства ў сферы культуры (аб гэтым — у асобнай публікацыі) і турызме. Ёсць канкрэтныя дамоўленасці па пракладанні турыстычных маршрутаў, у планах — адкрыццё новага авіярэйса, які злучыць Беларусь і Узбекістан.

Як звярнуў увагу **старшыня Камітэта Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан па пытаннях міжнародных адносін, знешнеэканамічных сувязяў, замежных інвестыцый і турызму Раўшанбек АЛІМАЎ**, цікавасць да супрацоўніцтва з Беларуссю ва Узбекістана была заўсёды. «Нашы адносіны маюць глыбокую гісторыю, але гэта цікавасць у некалькі разоў узрасла за апошнія гады, — заўважыў ён. — Мы ўбачылі, што Беларусь дзякуючы рэформам і пераўтварэнням дасягнула такіх вышынь развіцця, мае такі патэнцыял, які цікавы Узбекістану. Гэты візіт паказаў, наколькі мы сапраўды можам ажыццяўляць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, сумесна дасягаць яшчэ большых вынікаў. Хачу падзякаваць беларускаму боку за цудоўную арганізацыю ўсіх мерапрыемстваў візіту, за традыцыйную беларускую ветлівасць і гасціннасць і запэўніць, што мы, парламентарыі, зробім усё, што ад нас залежыць, каб на практыцы рэалізаваць дасягнутыя дамоўленасці. А яны адкрываюць зусім новыя магчымасці — можна сказаць, новую старонку. Нам здавалася, што мы вельмі шмат робім, але візіт паказаў, што работы яшчэ непачаты край».

Плануецца, што беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум набудзе фармат традыцыйнага мерапрыемства, якое будзе праходзіць пад эгідай верхніх палат парламентаў і стане неад'емным элементам стратэгічнага беларуска-ўзбекскага партнёрства.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ДЗЕЛЯ РОСТУ І ЎЗБАГАЧЭННЯ

**У межах Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму адбылося пасяджэнне секцыі «Культура і турызм — патэнцыял узаемных кантактаў». У ходзе сустрэчы абмеркавалі ролю і месца міжнароднага турызму ў сістэме эканамічных адносін Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан, рэалізацыю сумесных культурных праектаў у галіне тэатральнага і музычнага мастацтва, спыніліся на перспектыве супрацоўніцтва ў музейнай дзейнасці.**




— Гуманітарна-культурная сфера мае добрыя вынікі ўзаемнага супрацоўніцтва, — сказаў, адкрываючы секцыю, **міністр культуры Беларусі Анатоль МАРКЕВІЧ**. — Мы прырастаем новымі цікавымі праектамі, ініцыятывамі. Паміж навучальнымі ўстановамі ў сферы культуры ў нас заключана больш за 400 пагадненняў. Мы ўзаемна пераймаем вопыт і прымяняем яго ў нашым паўсядзённым жыцці... Сёння мы гаворым пра турыстычны патэнцыял паміж нашымі краінамі, і, думаю, павінен адбыцца актыўны ўзаемны абмен поглядамі, бо і вам, і нам ёсць што прапанаваць. Упэўнены, наперадзе ў нас яшчэ шмат сумесных праектаў, якія паслужаць умацаванню нашых узаемаадносін.



Перад абмеркаваннем гасцям і ўдзельнікам мерапрыемства прэзентавалі выстаўку культурнага і турыстычнага патэнцыялу Беларусі. Можна было ўбачыць палітру павільёнаў, дзе прадставілі работы рамеснікаў, рукадзельніц, пазнаёміцца з галоўнымі народнымі святамі і абрадамі, фестывалямі, дакрануцца да гісторыі, адчуўшы яе подых у дэкарацыях ваеннай экспазіцыі. А яшчэ паслухауць студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

— Сімвалічна, што наша секцыя праходзіць у сценах Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. Хачу адзначыць, што Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і гэтая культурная ўстанова маюць глыбокую сувязь. Таму шчыра ўдзячная за магчымасць правесці пасяджэнне секцыі на гэтай цудоўнай пляцоўцы, а таксама за ўсебаковую дапамогу ў яе падрыхтоўцы, — адзначыла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна АБЕЛЬ**. — Пошук новых магчымасцяў для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, умацавання ўжо існуючых эканамічных і культурных сувязяў паміж Беларуссю і Узбекістанам з'яўляецца адным з ключавых кірункаў гэтага форуму. Багатая культурная і гістарычная спадчына абедзвюх краін, дзе і прыроднае багацце, і гасцінныя людзі, — тое, што можа стаць падмуркам для эфектыўнага супрацоўніцтва ў сферах культуры і турызму.

Узбекістан — краіна вялікага культурнага і турыстычнага патэнцыялу. Ташкент, Самарканд, Бухара — гарады з вялікай гісторыяй. У сваю чаргу ўзбекскіх турыстаў могуць зацікавіць Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Мірскі замак, Белавежская пушча і шмат іншых цікавых лакацый для адпачынку ў Беларусі.

У ходзе дыялогу абмеркавалі шмат тэм. **Кацярына ДУЛАВА, генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета**, распавядала пра супрацоўніцтва ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтва:

— Нягледзячы на адлегласць у 4000 кіламетраў паміж Ташкентам і Мінскам, нашы народы многае аб'ядноўвае. У тым ліку пытанне захавання духоўна-гістарычнай, культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый і нацыянальнай аўтэнтычнасці. Сумесныя форумы, фестывалі, дні культуры, разнастайныя творчыя праекты — гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй і культурай нашых краін, адчуць іх самабытнасць. Творчая спадчына Вялікага тэатра Беларусі фарміравалася прадстаўнікамі розных рэспублік, для многіх з якіх наша краіна стала родным домам. Мір, узаемаразуменне, міжнацыянальная, этнакультурная, міжканфесійная згода сталі візітнай карткай Беларусі. Невыпадкова пасля Вялікай Айчыннай вайны Вялікі тэатр стаў прызнаным цэнтрам па абмене творчым вопытам для тэатраў Савецкага Саюза. Першыя творчыя кантакты з Узбекістанам адносяцца да 1952 года. Фестывалі, гастролі, сумесныя творчыя і адукацыйныя праекты — у такіх напрамках цяпер сканцэнтравана ўзаемадзеянне дзвюх нашых культурных устаноў.

**Алена КЛІМОВІЧ, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама**, звярнула ўвагу прысутных на тэму развіцця культурнага і падзейнага турызму на базе старажытных гістарычных цэнтраў Беларусі. Гаварылі таксама пра экспарт адукацыйных паслуг, пра патэнцыял беларускай сталіцы і пра тое, што Узбекістан можа прапанаваць беларускаму турысту.



— У сучасным свеце турызм з'яўляецца адной з найбольш дынамічных галін эканомікі. Патэнцыяльныя магчымасці Узбекістана дазваляюць пры належным узроўні развіцця турызму прымаць да 15 мільёнаў турыстаў у год. Аднак на сёння колькасць наведвальнікаў нашай краіны складае толькі каля 5 мільёнаў, — распавяла **дырэктар і заснавальнік ААТ MUINAK TOUR Аміна БЕКЖАНАВА**. — Сучасны турызм ва Узбекістане адрозніваецца разнастайнасцю відаў і форм. Ёсць экалагічны, гістарычны, спартыўны, этнічны, агратурызм, фестывалі і многія іншыя прапановы. І калі мы гаворым пра ўзаемадзеянне нашых краін у галіне турызму, то павінны разумець, якое важнае значэнне гэта мае для нашых эканомікі і культуры. Гэта спрыяе развіццю Беларусі і Узбекістана, таму нам варта выбудоўваць усебаковае супрацоўніцтва. І калі мы гаворым пра турыстычны патэнцыял паміж дзвюма краінамі, то павінен адбыцца актыўны ўзаемны абмен вопытам.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ПА ЗАКЛІКУ СЭРЦА

## Карэспандэнт «МС» высвятляла на прыкладзе Асіповіцкага раёна, хто і навошта ідзе ў апалчэнцы

**У Асіповіцкім раёне яшчэ летась паклапаціліся стварыць атрады народнага апалчэння ў кожным сельсавеце. У якасці добраахвотнікаў выступаюць нават жанчыны. Прыемна, што шмат хто адразу ж выказаў жаданне сустрэцца з карэспандэнтам «МС». Уражанні самыя што ні ёсць станоўчыя.**

Старшыня Вяззеўскага сельсавета Уладзімір Чыгілейчык першым чынам паказаў найпрыгажэйшыя мясціны, якія тут берагуць і шануюць. Гэта відаць па акультураных зялёных зонах, парадку на вуліцах. Сельсавету пашчасціла з размяшчэннем. Шыкоўнае вадасховішча з астравамі, разнастайным жывёльным і раслінным светам. Дамы ў аграгарадку дыхтоўныя, людзі трымаюць свойскую жывёлу. Мой гід таксама чалавек сумленны і працавіты.

Старшыня сцвярджае, што ў Вяззі практычна няма абібокаў, усе пры справе. А калі ёсць справа, значыць, людзі неабыякавыя і абараняць ёсць што. Суразмоўнік кажа, што калі паўстала задача стварыць атрад апалчэнцаў, першыя добраахвотнікі адразу заявілі пра сябе. Перад тым як з імі пазнаёміцца, збочваем на тэрыторыю знакамітага аздараўленчага лагера «Крыніца» на беразе вадасховішча ракі Свіслач. Слава пра яго грымела яшчэ з тых часоў, калі яго кіраўніком быў цяперашні старшыня сельсавета Уладзімір Чыгілейчык. Менавіта на базе яго 23—24 верасня адбудуцца першыя зборы апалчэнцаў. Падрыхтоўка да іх прыёму стартавала ў пачатку верасня.

Патрабаванні да кандыдатуры апалчэнца жорсткія. Такіх адабралі 25 чалавек. Некалькі з іх спецыяльна прыйшлі на сустрэчу з карэспандэнтам «МС».

Сяргей Гарадзецкі нарадзіўся ў вёсцы Вяззя і, як той казаў, тут і прыгадзіўся. Пасля тэрміновай службы ў Афганістане (ахоўваў знакамітыя трагічнымі падзеямі перавал Саланг) вярнуўся ў родную вёску і працуе трактарыстам у ААТ «Авангард-Ніва». З ранку ўжо на рабоце. А яшчэ ёсць уласная гаспадарка. Сам працаўнік і сыноў Яўгена і Мікалая да працы заахвоціў.

— Усяму, што сам умеў, іх навучыў, — з пачуццём выкананага доўгу кажа суразмоўнік. — У вёсцы гультаёў няма. Адзін сын дом пабудаваў, другі будуе. Яны яшчэ і мяне перасягнулі. Цяпер інтэрнэт ёсць, яны больш за мяне ведаюць.

Да абароны радзімы ў Сяргея Гарадзецкага самыя глыбокія пачуцці.

— У мяне калі спыталіся: ці гатовы радзіму абараняць? — адразу сказаў: вядома, — удакладняе ён. — Я прысягаў, што буду сваю краіну абараняць. Гэта ж наша радзіма. Таму калі прапанавалі ўступіць у атрад апалчэнцаў, я нават не разглядаў іншыя варыянты. Хутка пайду на зборы разам з сынам Яўгенам. Толькі ён у «партызаны» (ваенныя зборы для ваеннаабавязаных). Служыў у батальёне міліцыі. Ведае, як зараджаць зброю.

Сяргей лічыць, што сёння трэба быць напагатове і ўмець абараняцца. «Вунь у суседнюю краіну колькі зброі паступае, гэта небяспечна, бандытызм можа пачацца, — рэзюмуе ён. — І мужчынам трэба ўмець абараняць сябе і сваю сям'ю, дом, вуліцу. З нахабнымі ў нас гаворка кароткая».

Яшчэ адзін апалчэнец Ігар Андрыевіч згадвае колішні досвед.

— У школах была пачатковая ваенная падрыхтоўка, усе яе праходзілі — і дзяўчаты, і хлопцы, — кажа ён. — З бадзёрым настроем рыхтаваліся да «Зарніцы». І гэта было нармальна. Нас і ў часць воінскую вадзілі, і ў палатках жылі — рамантыка.

Ігар Мікалаевіч — паляўнічы, страляць, калі што, умее. «Голымі рукамі нас не возьмеш, кажа ён. — Мы за наша Вяззе пастаяць зможам».

Васіль Пятроўскі — камандзір атрада народнага апалчэння на тэрыторыі Вяззеўскага сельсавета, асоба ў раёне паважаная, былы першы намеснік старшыні райвыканкама, цяпер на пенсіі, гаспадар адной з тутэйшых аграсядзіб.

— Мы на месцы, калі наша дапамога спатрэбіцца, адгукнёмся адразу ж, — кажа ён. — А дапамога наша можа спатрэбіцца для падтрымання парадку. Не адрываць жа для гэтага падрыхтаваных байцоў.

На погляд Васіля Сямёнавіча, для апалчэнца галоўнае — разуменне адказнасці за лёс сваёй радзімы. Калі нешта здарыцца, будзе не да жартаў. Прыйдзецца тэрмінова мабілізавацца для агульнай справы.

— Павінны быць спакой, парадак і дысцыпліна, — лічыць ён. — А калі нехта з нашых грамадзян гэтага не разумее, трэба яму падказаць. Некаторыя жывуць бяспечна, спадзяюцца, што за іх падумаюць, абароняць і ўсім неабходным забяспечаць. Яны прывыклі, што ўсё добра, і не разумеюць, што можа быць інакш. Нельга быць адарванымі ад жыцця, яго пасіўным назіральнікам. Раней былі дружыннікі, якія выходзілі і дапамагалі захоўваць грамадскі парадак. Апалчэнцы павінны рабіць тое ж самае, быць надзейным прыкрыццём. Нельга дапускаць, каб сярод насельніцтва ўзнікла паніка. Страх паралізуе. А ў экстрэмальных сітуацыях трэба дзейнічаць адказна. Могуць узнікнуць праблемы з падачай вады, электрычнасцю, і трэба будзе прымаць рашэнні. Дзесьці спатрэбяцца рабочыя рукі. Ёсць людзі, якім трэба дапамагчы.

— Народнае апалчэнне — гэта збольшага людзі, прайшлі школу жыцця, — кажа суразмоўнік. — На месцах павінен быць парадак.

Не менш адказна ставяцца да стварэння атрадаў народнага апалчэння ў Свіслацкім сельсавеце. Выконваючы абавязкі старшыні Аляксей Траццякоў — падпалкоўнік у адстаўцы. Наколькі сур'ёзная гэтая справа тлумачыць яму не трэба.

— У адпаведнасці з Законам аб народным апалчэнні, апалчэнцамі могуць быць тыя, хто не падпадае пад мабілізацыю ў выпадку вайны, — кажа ён. — У маладых ёсць ваенна-ўліковая спецыяльнасць, іх задача акрэслена выразна, на час вайны ён прыпісаны да канкрэтнай вайсковай часці. Нашы апалчэнцы — гэта ў асноўным пенсіянеры, якія па стане здароўя могуць яшчэ паслужыць радзіме. Асіповіцкі раён — край паляўнічых, аддаём перавагу тым, хто ўмее трымаць стрэльбу. Іх у першую чаргу і абзванілі.

У сельсавеце 14 вёсак, у кожнай свае абароны. Іх колькасць залежыць ад таго, колькі там пражывае насельніцтва. Калі вёска маленькая, хопіць і 3-4 чалавек.

— Трэба разумець, што народнае апалчэнне — гэта не тэрытарыяльная абарона, якая займаецца аховай асабліва важных аб'ектаў і падпарадкоўваецца непасрэдна мясцовай уладзе (дапамога Мінабароны), — заўважае Аляксей Траццякоў. — Апалчэнцы — гэта памочнікі для міліцыі. У выпадку вайны народнае апалчэнне падпарадкоўваецца непасрэдна начальніку мясцовага РАУС. Людзям выдаецца зброя, боепрыпасы. Тых, хто займаецца тэрытарыяльнай абаронай, запросяць у лагер, апалчэнцы застаюцца на месцах і будуць аказваць дапамогу праваахоўнікам па наведзенні грамадскага парадку, прадухіляць выпадкі марадзёрства. Кожны з нашых кандыдатаў гатовы ахоўваць свой дом, сваю вёску.

Калі чалавек абараняе сваю зямлю, добра арыентуецца, яму лягчэй ваяваць, выявіць дыверсійна-разведвальныя групы, лічыць суразмоўнік. Мясцовы жыхар ведае ўсіх у твар. На фоне апошніх падзей трэба быць асабліва пільнымі. Народнае апалчэнне — вялікая дадатковая сіла, якая рэальна абараняе сваю краіну.

Мясцовы жыхар Аляксандр Забаўскі — адзін з добраахвотнікаў. Кажа, што калі спатрэбіцца, нават са сваім ружжом прыйдзе.

— Я гатовы да абароны, — кажа ён. — За сябе пастаяць умею. Гэта мая радзіма, тут нарадзіліся мае дзеці. Сэрца маё тут.

Камандзіру Свіслацкага атрада народнага апалчэння Івану Шаўчонку ўжо 77 гадоў, але вонкава выглядае малайцом. Тэрміновую службу праходзіў у канцы 1960-х у Польшчы. Калі ў Чэхіі пачаліся хваляванні, некалькі месяцаў прыйшлося знаходзіцца там на ваенным становішчы, пакуль не прыслалі полк з Івана-Франкоўска. Потым вернасць краіне пацвярджаў сваёй працай. Мае медаль «За працоўную доблесць» і ордэн «Знак Пашаны». Працаваў механізатарам у калгасе «Усход», займаў першыя месцы ў раёне на ўборцы ў 70-я. Уставаў у 5 гадзін, а дадому вяртаўся ледзь не апоўначы. Тэхніка тады была не тая, што сёння. Ніякіх табе кандыцыянераў і халадзільнікаў.

— Апошнім часам пільна адсочваю навіны, яны трывожныя, — уздыхае суразмоўнік. — Калі нехта сунецца на нашу зямлю, лягу, але ворага не пушчу.

Касцяк асіповіцкіх народных апалчэнцаў складаюць мужчыны, але ў некаторых сельсаветах рады добраахвотнікаў папоўнілі і жанчыны. У Татаркаўскім сельсавеце іх нават дзве — кіраўнік спраў сельсавета Інеса Ляйко, якая на выпадак ваеннага становішча выступае медработнікам, і фельчар Ірына Патупчык.

— У нашым сельсавеце наогул ніякіх праблем са стварэннем атрада не было, — кажа старшыня сельсавета Віктар Рамашка. — Людзі вельмі адказна падышлі да гэтага пытання. Мы ж чуем і бачым, што адбываецца вакол нас. Трэба быць гатовымі да ўсяго. Наш сельсавет невялікі, адзін рабочы пасёлак колькасцю прыкладна шэсцьсот чалавек. Атрад складае 11 чалавек. У асноўным гэта паляўнічыя і егеры.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



**Выконваючы абавязкі старшыні Свіслацкага сельсавета Аляксей ТРАЦЦЯКОЎ (пасярэдзіне) з апалчэнцамі Аляксандрам ЗАБАЎСКІМ (справа) і Іванам ШАЎЧОНКАМ.**

### У тэму

**Старшыня Асіповіцкага райсавета Сяргей СУВЕЕЎ:**

— Яшчэ ў канцы мінулага года мы склалі спісы апалчэнцаў па кожным сельсавеце. Праводзілі работу з людзьмі, звяралі спісы з кампетэнтнымі органамі. Пасля прыняцця Закона аб народным апалчэнні спісы былі канчаткова сфарміраваныя. Правялі ў працоўных калектывах адзіныя дні інфармавання. Растлумачылі неабходнасць узнікнення такога закона, і людзі гатовыя аказаць дапамогу і падтрымаць.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.387. Нумар падпісаны ў 19.30 12 верасня 2023 года.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

